**Галіна Каржанеўская**

# Асенні мёд

*Вершы розных гадоў*

Мінск
Мастацкая літаратура
1999

УДК 882.6-1
ББК 84 (4Беи) 6

# Паміж явай
# і сном

ISBN 985-02-0120-7
© Г. А. Каржанеўская, 1999

* * *

Што трэба траве,
каб яна ажыла,
Зялёнай зрабілася,
цешыла вока?
Патрэбна адліга,
і трошкі цяпла,
І промень, што доўга блукаў
між аблокаў.
Што трэба рацэ,
каб яна пацякла
Раздольна,
без лёдавай цяжкай апекі?
Патрэбна адліга
і трошкі цяпла.
Чакаюць,
чакаюць знямелыя рэкі...
Што трэба душы,
каб у ёй не было
Зацятасці згубнае,
вартае жалю?
Цяпло чалавечае.
Толькі цяпло,—
Трава, і рака, і душа
адказалі.

* * *

Груша нас асыпала пладамі.
Грушапад —
як калісь зарапад.
Дружа мой,
што зрабілася з намі?
Мы пакінуты добрымі снамі.
Дык уперад ідзём ці назад?

Калі праца становіцца богам,
Тады Бог адварочвае зрок.
Часу мала,
а тлуму так многа,
І кружляць пачынае дарога,
І тады ўжо ніхто не прарок.

Каб зусім у паток не кульнуцца,
Каб не ўпасці у згубу і грэх,
Навучаюся хітрай навуцы,
Як мне думак спыніць кругабег.

Ты ж і гэта высмейваць гатовы,
Ўсё прыспешваеш хвілі і дні:
Будзе лепей у заўтрашнім,
новым
І як дзічкі качаюцца словы,
Што да сэрца не дойдуць ані.

* * *

Бурылі цэрквы,
і тынкоўкі пыл
Смугой гарачай засцілаў пагляды.
Не бачылі ні ўнукавай пагарды,
Ні дзедаўскіх абражаных магіл.
(Падрыўнікоў
прывезлі з Ленінграда.)

Спяшаліся падпісваць і рашаць.
Глядзеў народ маўкліва —
атэісты.
Прыезджы адвярнуўся: «От вже біси!»
(У Кіеве як макаўкі гарадь!)

Апомнімся.
Праз колькі там гадоў,
Калі прагрэс свае падніме шалі,
Зноў давядзецца выклікаць майстроў —
Рэстаўраваць усё,
што не ўзарвалі.

* * *

Штосьці пуста ў маіх засеках,
Штосьці воля мая — як з ваты.
Штосьці думкі мае — як рэкі,
Паспрамляныя сілай, гвалтам.

З акцябрацкіх год да юнацкіх
Працавалі са мной нямала,
Каб савецкім, а не чужацкім
Я стандартам адпавядала.

Вучаніцай была стараннай.
Што нязвыклае — тое вытры,
Пара рысак — і панарама,
Пара фарбаў — і ўся палітра.

Ах, аматары танных ісцін,
Пладавітых, нібы амёбы!
Вы даводзілі нам калісьці,
Што ўсё наша —
вышэйшай пробы.

Вы нязменна дзвюма рукамі
Благаслаўлялі грахі і беды.
Падманулі майстры — і самі
Выкідаюць пярсцёнак медны...

## ДЗІРВАН

Кідаеш зерне, думаеш — узыдзе...
А сейбітаў мо болей, чым зярнят,
І пустка як была
сто год назад,
Так і цяпер не ведае аб жыцце.

Ні з плугам,
ні з рыдлёўкай незнаёмы,
Спрадвеку самаўпэўнены дзірван
Ваўчкі гадуе, спеліць дурнап'ян —
Ён сам сабою
дужа здаволёны.

Спякота і дажджы, гады і хвілі.
Жыццё ці існаванне?
Ў ім, бадай,
Ёсць веліч —
вунь залёг пад небакрай,
І ёсць зацятасць — каб не зачапілі.

І для чаго рыхтуе нетаропка
Ён сам сябе — загадка, далібог.
Напэўна, сніць калоссе ці мурог.
Дык трэба сеяць. Працаваць.
І кропка.

* * *

Тады лунаюць згадкі-мроі,
Калі пра ежу і пра строі
Не трэба думаць ды гадаць,
Дзе што знайсці
і як дастаць.

Тады душы тваёй свабодна,
Калі існуе дух народны
Без перашкод і забарон.
Дзе забарона — волі скон.

Тады ты ў лепшае паверыш,
Калі на сэрцы згода, неруш.
Дзе тая згода?
Дзе той лад?
Замнога будняў — мала свят.

Я бестурботную хвіліну
Ў скарбонку памяці закіну,
Каб між замучаных, змарнелых
Яна, што зорка, зіхацела...

* * *

Я слухала, як дождж ішоў,
Як стукаў кроплямі па шыбах.
Няспешна, неахвотна нібы
Распавядаў на нейкай з моў,
Што сталі слабымі бацькі
І даражэе ўсё дарога,
Што змен навокал хоць і многа,
А радавацца не з рукі;
Што хутка ружы закрываць,
Што сёлета грыбы з атрутай,
Што час, расхрыстаны і скрутны,
Яшчэ не скончыўся, відаць;
Што куранят пара лічыць,
Бо восень зноў жа,
                                        год на сконе...
...І не прыкмеціла сутоннем,
Што я шапчу,
                                        а дождж — маўчыць.

* * *

*Слуцкай радні*

Дзе вы, гады мае, блукаеце,
Калі яanaч спаць кладуся?
Напэўна, часу многа маеце —
І ў лесе скачаце, і ў лузе.

А можа, вёскай паўзабытаю
Ідзеце
             (сны мне падказалі),
Якую звалі Аксаміты,
А потым націск памянялі?

А ёсць яшчэ адна —
                                        няблізкая
І даражэйшая у свеце,
Дзе баба гойдала калыску;
Вы і яе не абмінеце.

Уколе памяць занядбаная:
— Даўно Лясішча не наведвала.
Жыве радня там спрацаваная,
Але прыязная і ветлая.

Мае гады, мае таварышы,
Мае настаўнікі харошыя...
Набытак ваш
                             бяссоннем важу я,
А ранкам клічу з падарожжа.

* * *

Прачынаецца дзень,
предзірае заспаныя вочы,
Намагаецца сну адгалоскі прыпомніць,
аднак
З недаробленых спраў ні адна
пачакаць не ахвочая,
Нецярплівыя ўсе,
як гатовы да скачак рысак.
Прачынаецца дзень, пазяхае,
адсоўвае штору,
Памарудзіць крыху, а затым
з галавой патане
У людскім, гарадскім,
калгатнёю успененым моры,
Дзе закінуты сеці
і дрэмлюць пачвары на дне.

**НАТОЎП**

Ён усмокча, атуліць сабой,
І станет адразу малой.

Не можа быць годнасці
ў мізарнечы,
У клеткі (сюды б мікраскоп!).
І слова спагады,
і шэпт варажнечы —
Усё зацірае натоўп.

І той, дзе кіпяць
мітынговыя страсці,
І вулічны, транспартны — той,
Дзе людзі, асобы адметнае масці,
Становяцца площчю адной.

А ў плоці законы свае, як вядома.
Галёкае хамства мне ўслед,
Ды я выдзіраюся.
Вольная — дома.
І хоць прыціскае, выкручвае стома.
Не клетка я болей, а свет!

**З гарадскога фальклору**

**I**

Вятрыска буйны, куды імчыш ты?
Ці нагуляцца у полі чыстым?
Ці хмару далей прагнаць — навалу?
Ці ў лесе сосны гайдаць памалу?

Чужы мужчына з букетам кветак,
Ці ты да жонкі бяжыш і дзетак?
Ці да матулі? Ці да каханкі,
Што марафет навяла ад ранку?..

**II**

Пралескі выпілі ваду
І назаўжды завялі.
Я на спатканку не пайду,
Мяне не запрашалі.
Мне белым июлем не хварсіць
Перад вясельнай ночкай,
А званне гордае насіць
Матулі-адзіночкі.
І над калыскай гарадской,
Што гойдацца не ўмее,
Я нахілюся галавой —
Аж сэрцу пацяплее.
А потым, гледзячы кіно,
Навіны ці эстраду,
З суседам буду піць віно —
З пузатым ды жанатым.
Пракантавалася зіму.
Эх, горка без мілёнка...
Пралескі выкіну вазьму
Ды вымыю пялёнкі.

**У чарзе**

Бедный чаплі
эпохі перабудовы,
Цені цярплівыя
ў неверагоднай чарзе,
Пераступаючы,
суткі стаяць вы гатовы,
Да запаветнага
рухаючы пакрысе.
О, недасяжнасць
усім неабходнае рэчы!
Прага набыць, і займець, і валодаць.
Яна
З'ела ўсе мары
і грузам прыгорбіла плечы,
І зразумець немагчыма,
чыя тут віна.
Гнуткай вужакай
чарга падпаўзае да касы.
«Колькі?» «Ці хопіць?»
«Скажыце, ці варта стаяць
Звыклая лаянка нашай,
«савецкай» акрасы
То затухае,
то зноў пачынае палаць.
Выпіўшы муж
патрабуе увагі і ласкі —
Ці памятаеце вы,
калі йдзеце дамоў?
Цёткі, кабеты і дамы
ў пакетах і звязках,
Зойдзеце цяжка ў кватэру —
і туфлі далоў.

**Перасяленка**

У перасяленкі сягоння свята —
Улазіны.
Хоць і бяскорміца,
А стол па-сялянску ломіцца.
Мэблі няшмат,
Ды гасцей багата.

Шчасця жадаюць,
А вочы долу.
Якое тут, людцы, шчасце!
Горачка ў новай хаце.
Сумныя навасёлы.

Перасяленка —
Не ўдава, не паненка.
Муж аб'еўся груш,
Бо дзіцёнак нядуж.
Галоўкі цяжкой не ўтрымаць.

Не можа ні сесці, ні стаць.
Ці на руках ён,
Ці на каленях.
А тут яшчэ перасяленне.

Усюды спраўляйся.
Як на крыжы —
У магазін, у ЖЭС, у аптэку…
Зіркае спужана хлопчык-калека,
Як з мамай танцуе
Дзядзька чужы.
Добра, што ціхі:
Ні крыку, ні енку...
Эх, нагаруешся, перасяленка...

**Горад**

— А-у-у...
Гукаю не ў дрымучым лесе —
Тут горад у бетоне і жалезе.

Ён прыручаць даўно не мае звычкі:
Гвалтуе ды ў палонніцы бярэ.
Свіцяцца на паверхах лямпы-знічкі,
Ганяе вецер смецце па двары.

З усіх пад'ездаў вее скразнякамі,
І я пакорна вуліцай брыду,
Намацваючы цяжкімі нагамі
Апрыклую зімовую слату.

Сабе належаць —
марная надзея,
Калі паўсюдна скаліцца стандарт,
Калі пустагалоўе вар'яцее,
Кал і хаос бярэ у заўтра старт...

Тут кліч — не кліч —
ніхто не адгукнецца,
У мерным гуле голас патане.
Няўжо забетаніраваны й сэрцы
У горадзе,
што стаў радзімай мне?

* * *

Шчэ спалі птушкі (снілі птушанят),
Падрэмвалі тралейбусы у парку,
І святлафоры, і электразваркі.
Адпачываў растоптаны асфальт.

Пара, калі ўтаймоўваецца шал,
Калі страсцей заземлена маланка,
Калі гуляку звальвае гулянка
У прысак весялосці, напавал.

А хто не спіць,
таго ты пашкадуй,
Бо чорных думак больш, чым каляровых.
Яны, не увасобленыя ў словы,
Збіраюцца ў кагал, як на бяду.

Віюцца і вярэдзяць...
Чуўся мне
Аднекуль голас прышласці і праўды:
— Перапіліць не зможаце вы краты,
І воля вас не пацалуе, не!

— Але чаму? Няўломкі, далібог,
Не горшай, мабыць, створаны часінай.
— Таму што Бог,
вас вылепіўшы з гліны,
Цярплівасць даў, а мужнасць прыбярог.

* * *

Калі народ ідзе на звод,
Губляе ўпэўненасць народ.

Ён, як сляпы на раздарожжы,
Гатовы кідацца ў бакі
І па жыцці ніяк не можа
Ісці без нечае рукі.

Калі народ ідзе на звод,
Зацятым робіцца народ.

Ён пазбягае горкай праўды
І, у чаканні лепшых дзён,
Не церпіць жалю і спагады,
Бо сам сябе шкадуе ён.

Ён звыкла слухае прамовы,
На працу раненька ўстае,
А ім не сказанае слова
Баліць
 і грудзі рве мае.

* * *

Гісторыя — не могільнік глухі,
Дзе подзвігі людскія і грахі
З нябожчыкамі разам закапаны.
Гісторыя балючая, як рана.
Яна ўвайшла у нашу плоць і кроў
І плоццю, і крывёю продкаў нашых.
Адно спытайся — многа што раскажа,
Адно не грэбуй лепшымі з дароў —
Усім, што нам пакінула пяро,
Ганчарны крут, сякера і цясла,
Легенда невялічкага сяла...

Гудуць, гудуць удзень і уначы
Званы гадоў.
 Над вамі. Нада мною.
Калі глядзіш звысока на былое,
Сябе хаця сучасным не лічы!

Гісторыя — не могільнік глухі...

* * *

Як б'ецца муха ў павуціне,
Успамінаць штось не люблю.
Пакуль мучыцель не накіне
На шыю даўкую пятлю,
Яна на волю спадзяецца,
На справядлівасць,
можа быць.
А зверху бог яе смяецца
І не міргаючы глядзіць.

**Іранічнае**

Трэба йсці, мяне чакаюць дома.
Гэта цень самоты, а не стома.
Што «градзёт» — нікому не вядома.
Ад зялёных яблыкаў — аскома.

Перастаньце! Я ўжо не малая.
Тактыка знаёмая такая...
Некалі казалі: гонар маю.
Лічыце, задоўга выспяваю?

І застой, і плесня там, дзе схемы.
У людзей інакшыя праблемы.
У віры матляемся усе мы.
Справы дрэнь: падводзяць тэарэмы.

Як іх штампавалі год ад году,
Сапсавалі гэтулькі народу.
А вы мне тут —
пра камерную згоду...
Пра сябе і думаць неахвота!

* * *

Мышыным піскам
у ката ў зубах
Літанні нашы, скаргі ды праклёны.
Яшчэ крыху — і бэндзеш здавалёны,
І ўсё у былым, далека — «ох» ды «ах».

Хто можа, той пакорліва. маўчком
Прымае непрадбачаныя плюхі,
Каб божая дзясніца
лёгкім рухам
Перахрысціла ўслед за малатком.

Каму ж пакоры доля не дала,
Той бэсціць разам пекла і нябёсы.
І хто тут выйграе —
ці безгалосы,
Ці бунтаўшчык —
адказу не знайшла.

* * *

Хто звёў на дарожцы
Дабро са Злом,
Хто знае наперад
усе нашы крокі,
Той і мяне спрабуе на злом —
Есць маю сілу,
п'е мае сокі.

Хто веліч сваю дэманструе спрадвек
(Бо ўсемагутны,
адзіны
і вечны),
Той хоць і вымучыць, як чалавек,
Ды безнадзейна
бесчалавечны.

**Трыпціх памяці**

*Прывыкаю крычаць без голасу,*
*Прывыкаю плакаць без слёз.*
*Тамара Чабан*

**I**
Сяброўкаю
ты стала мне тады,
Калі ўжо смерць
сваё сіло звівала.
Падглядвала зларадна,
цікавала,
І ты жыла
з прадбачаннем бяды.
Смяшлівая,
прыхоўвала тугу
Па тым,
з чым развітацца давядзецца.
І як відушчае тваё
балела сэрца,
Таго і уявіць я не магу.

**II**
Не напішу я успамінаў:
Такія плыткія карціны...
Вось мы на Іслачы, у лесе,
І дым кастра у вочы лезе.
Вось мы ў бяседзе таварыскай,
Вось ты над Вольчынай калыскай...

Як вобраз выплыве павалі
З туману памяці і болю,
Ты ўсё гамоніш там — жывая,
Ды ні пра што я не пытаю.

**III**
Памятайце ж усіх,
хто заўчасна аціх,
Хто навек пасяліўся ў нябыце.
Памятайце усіх, памінайце усіх,
Толькі лепшых
яшчэ і любіце.

* * *

Нас падхапіла існая плынь
Ўсіх, грамадою.
Так і сплываем удалячынь
Разам з вадою.

Станы губляюць юначы абрыс,
Сэрцы — давер'е.
Хваля кідае то ўгору, то ўніз
Нас, быццам пер'е.

І чым далей ад вытокаў плывём,
Тым усё цішай
Тая рака, што завецца жыццём,
Хваляй калыша.

* * *

Я гэтак гляджу
На мурожныя травы,
На гулкія сосны,
На промень рухавы!

Я гэтак гляджу
На палі і лясы,
На ўсмешкі хлапцоў,
На дзяўчат валасы.

Я гэтак гляджу
(Замірае душа)
На ластаўкі лёт
І на спрыт мураша.

Я гэтак гляджу
На грыбы і калоссі,
Як быццам хвіліну
Мне жыць засталося.

**Вечаровае**

Прыгасне сонца, коцячыся ўніз,
І одум пакладзе руку на плечы.
Былое, як падлеткавы капрыз,
Падасца неразумным,
недарэчным.

Няўжо ману магла не заўважаць?
Чаму як заўважала — даравала?
Пытаюся — і мушу адказаць:
Таму што без развагі пакахала.

Ва ўладзе ачышчальнага агню,
Пакутлівай хвілінаю і шчаснай
Узносіла цябе на вышыню,
Для воч недасягальную
уласных.

Праз далячынь,
праз мяккае святло
Хай вечар дальназоркі тое ўбачыць,
Што найдарожшым некалі было
І што цяпер ужо так мала значыць.

**Крыды**

*У пчол хутка зношваюцца крылы.*
*(З газеты)*

Лёгка, лёгенька я калісь
Засынала і сноў не сніла.
Дык чаму не звяду вачэй?
Зношаны крылы?

Я табою жыла.
Ад зла,
Як магла, бараніла.
Ацішэлі, астылі дні.
Зношаны крылы?

Ношкі цяжкае не бяру,
Зёлкі ў лузе — не тыя...
Кажуць, мне берагчы пара
Крылцы слабыя.

Ды, бывае, яшчэ ляту.
І адкуль тая сіла!
Чую: новыя шалясцяць,
Адрастаючы, крылы!

* * *

Сон быў крамяным,
Шпаркімі — сцежкі...
Думкай туды палячу.
Вершы трапляліся,
Я к сыраежкі:
Бяры — не хачу.

А зараз каторы
Як знойдзецца —
Свята,
Выпорваеш з гліцы густой.
Такою сябе
Адчуваеш багатай
І — не пустой...

* * *

Чым я свабоду заслужыла
Ад вершаў?
Вернасцю вясне?
Ці патайною новай сілай,
Што перайначыла мяне?

Ці, можа, проза засмактала,
Ці час
(узрост, што ні кажы)..
Ці раптам нейкага не стала
Інгрыдыенціка ў душы?

А як звінела і бруіла
Крынічка —
толькі ўспамінай!
Чым я за волю заплаціла —
Ніхто не ведае, бадай.

**Начныя матылі**

Начныя матылі
У цемры мільгацелі,
Спачыць мо не хацелі,
А мо і не маглі.

Начныя матылі
У час падзення зорак,
Не ведаючы гора,
Жылі, як каралі.

Гулялі апантана,
Увасаблялі шчасце,
Якога і не ўкрасці,
І не пазычыць нават.

Начныя матылі
Мяне не заўважалі...
Я з цяжкай ношкай жалю
Ступала па зямлі.

У час згарання знічак
Пыталася душа:
Адкуль узяўся жаль?
Каго мой жаль датычыў?

* * *

Ты зноў запытальна глядзіш,
Як быццам табе не па сіле
І твой непрадбачаны крыж,
І жыцце загнанае, ў мыле.

О так, я хацела б табе
Прынесці хоць трошкі палёгкі,
Разгладзіць палоскі на лбе,
Прыбавіць рашучасці кроку.

Пяшчота, спагада і жаль
Хіба не замена каханню?
Амаль не заўважна мяжа,
А ў позірку ўсё ж —
запытанне.

## Аналогіі

Парастак кволы — цененькі,
мне не знаёмы ані.
Сонца заспанае, млявае —
ледзь працінаюць туман прамяні.
Ветру дыхание слабое,
што ліст не трывожыиь сабою.
Позірк нясмелы, прыхованы —
мною адчуты спіною.

Суджана парастку
дрэўцам разгалістым стаць, падужэць.
Сонцу — разліцца, як лава,
выпаліць поплаву шчэць.
Вецер разгон набярэ,
прымушаючы гнуцца жывое.
Ўраз пераверне жыццё —
той позірк, адчуты спіною.

* * *

Сцэнарыі выдатна піша Бог,
Шукае небанальныя сюжэты.
(Яшчэ не ўсе, на шчасце, перапеты.
Змусолены, зацёрты, як манеты.)
Дзе трэба пара,
ён збірае трох.

Хто пераможа, схіліцца к каму
Русявая няверная галоўка,
Незразумела Творцу самаму,
Але й прызнацца ў слабасці нялоўка.

Палямі прыцягнення на разрыў
Жанчыны выпрабоўваецца воля.
Душа раскрыжавана,
ў змроку доля,
Пужае двухаблічная няволя,
Зацягваюць два дужыя віры.

Сабе супраціўляцца не лягчэй.
Занятак, скажам прама, варты жалю.
На вуснах смех,
ды джаліць і пячэ
Пакуты злой раздвоенае джала.

А Творца, назіральнік і глядач,
У крызісе
(у творчым, зразумела):

— Дык што далей?
Чаго яна збялела?
Душа тут кіраўніца або цела?
Не плач адно, гаротніца, не плач...

**Амаль жарт**

*у. н.*

Святкуючы сваё зямное лета,
Я неяк жартам
рысу падвяла:
Не давялося мне кахаць паэта
(Хіба што закаханаю была).

А хто займеў
такую вось удачу —
Намэньчыліся, кажуць.
Бо для тых
Мы толькі сыравіна, не іначай,
Для новых вершаў, і паэм, і кніг.

Дый мы таксама рады
ўсё на свеце
Ў паэзію цягнуць, нібыта ў кош.
Ні па адным не сохла я паэце.
Бяды няма.
І ўсё ж...

* * *

Прысніўся мне сад у саспелых пладах.
Свяцілася груша, як лямпачка-сотка,
Паблісквала яблыка бокам салодкім,
Круглілася сліва, напятая сокам...
Ды сад быў чужым —
                                        вось якая бяда!

Няпрошанай госцяй хадзіла па ім,
Між дрэў абцяжараных марна блукала.
Ніводнага яблычка я не сарвала,
Ніводнае слівы ціхенька не ўкрала
У садзе даступным,
                                        але не маім.

Паддацца спакусе мне штось не дало.
... А раніцай, сон адганяючы ўладна,
Сабе я цвярдзіла: ніякага сада
Зусім не было, не было, не было...

* * *

Мы — паралельныя,
                                        горнія светы.
Вы нам браты,
                                        аднагодкі-паэты.
Розныя ў нас атачэнні і беды,
Ды ёсць і агульныя ўсё-ткі
                                        прыкметы.

Вершам не скажаш іх
                                        (мабыць, і прозай).
Звязаны снопікам нашыя лёсы,
І покуль не ўпалі
                                        у глебу зярняты,
Ўшануем сястру
                                        і даверымся брату.

## Сузіраючы ружы

Анёльскія, нянаскія стварэнні,
Найлепшы дар,
аздоба ўсіх сталоў,
Яны то ў юнака у цеснай жмені,
То ў вазе крышталёвай.
Чорных змоў,
Прадажных «дружбаў»,
хіжых парыванняў
Не ведаюць,
і наш «букет» людскі —
Для іх хіба што — сон благі пад ранне.
У іх і свет, і нораў не такі.
Адценняў пералівы.
Непаўторных,
Чароўных пешчаў россыпы.
Краса.
То на зямлю
сышла суквецця зорных,
Вышэйшых сфераў божая раса.
З пялёстаў у душу сцякае прана.
Матыль ляціць, каб асалоду піць.
А што кароткі век
(і непапраўны),
Дык гэта кветцы можна перажыць.

## Хто наступны?

Не лятаюць хрушчы,
мошкі мак не таўкуць.
Зрэшты, з макам у нас незадача:
Наркаманы сядзяць
на галодным пайку,
Самасейкі шукаюць на дачах.

Ну, а зойдзеш у лес —
усё роўна што ў склеп.
Хор птушыны спыніў існаванне
Ці наш брат-гараджанін
аглух і аслеп?
Хто наступны?
Чыё паміранне?

**Спяшаўся ты.**

Ты вёў мяне па лесе да азерца.
Ты гаварыў:
— Яно вунь там, зірні,
Рукой падаць, а там вала і неруш!
І я ішла стамлёнымі нагамі.

Спяшаўся ты.
Ты ледзьве паспяваў
Прытрымліваць калючыя галіны,
І кропелькі раздушаных суніц
На доле за табою крывянелі.

Спяшаўся ты:
— Вунь там яно, вунь там!

...Жаўцеў пясок.
Іржавыя начоўкі
Стаялі пасярэдзіне таго,
Што некалі было лясным азерцам.
А мы з табою позіркі хавалі.

**Лясы**

Лясы — нібы людскія душы.
Згадзіся, дружа.

Адзін — нібыта насланнё,
Прыдумка духа злога.
На сук напорацца анёл,
Сам чорт паломіць ногі.
Ў заплеснявелым гушчары
Прамень марнее, гіне.
Тут камары —
гаспадары,
Паганкі — гаспадыні...

Другі ж —
свіціцца, што абраз.
Празрысты, чысты, звонкі,
Здзіўляе нас і цешыць нас
Ён кожнаю сасонкай.
Увесь — імкненне угару,
Увесь — прастор і неруш,
Не паддаецца ён пяру,
Яму адразу верыш.

І зноўку паўтарыць я мушу:
Лясы — нібы людскія душы.

## Міцкевічаў дуб

Людзьмі загублены і часам,
Закуты ў мёртвае жалеззе,
Стаіць — мінуласці акраса —
Ў неверагодным нейкім лесе.

Той лес быў паркам адмысловым
Меў догляд,
                і не раз, бывала,
Паненак пекная размова
У ім як музыка гучала.

Аглухлі дрэвы і здзічэлі.
Дзе гаспадар
                і дзе садоўнік?
Чыё дыханне ліст шавеліць,
Калі за хмарку зойдзе поўня?

І чый там плашч мільгае цьмяна
Старога крою?
                Дуб няшчасны
Маўчыць, маўчыць...
                І часу тайна
Адно паэту падуласна.

## Ля Іслачы

Прасвечвае дно у рачулкі малой,
Прасвечвае час
                у мяне за спіной,
І ў срэбных яго пералівах
Мільгне то чый-небудзь
                зажураны твар,
То парачка з коранем вырваных мар,
То момант да глупства шчаслівы.

То раптам — наяве ці ў сне —
                як з магілы
Забытае прыйдзе
                (ў паглядзе папрок).
То выплыве прыкраспі нейкай шматок,
Якога і часу вада не адмыла.

Бруенне, мігценне, вяртанне былога
Няўцямнае.
                Прыхамаць плыткіх карцін.
З усіх гэтых вобразаў
                хоць бы адзін
Меў сэнс адавочны.
А як жа іх многа!..

І колькі занесена, знесена, змыта,
Ні праблеску болей, ні знаку — ані...
Гляджуся ў рухомыя
                сплыўшыя дні —
Сябе выглядаю — былую — нібыта.

## Зацьменне месяца

Зацьменне месяца.
Абручык залаты
І той пагас, растаў на небасхіле.
Запанавала цемра.
Цемра ў сіле
Адно часова, хвілю...
А тады
Ізноў заззяе край і акругліцца,
І поўня тут як тут
ва ўсёй красе,
Каб мы яе святло цанілі ўсе.
Яна свяцілу ўсё-такі сястрыца...

## Паміж явай і сном

Паміж явай і сном
каляровыя здані раяцца,
Паміж явай і сном
маіх мрояў плыве карабель.
А як толькі прачнуся —
садзіцца адразу на мель:
Супыняецца рух,
і няма больш на што
спадзявацца.
У салодкага снення
ні межаў няма, ні падставы
Якойсьці сур'ёзнай —
само сябе жывіць падчас.
Ды калі міражы так яскрава
наведваюць нас,
Значыць, ёсць у адбітка
рэальная недзе выява.

**Я там была?**

Ля Нарачы,
на востраве Наносы,
Сядзіць мой дзень,
распрануты і босы.

Ён цешыцца красой не перастане:
Вунь бераг супрацьлеглы
у тумане.
Вунь чараты, і лебедзі, і хвалі,
Што і цябе
аднойчы ўжо гайдалі.
Прывязаная лодка.
Небакрай —
Такі, што хоць пагляд не адрывай.
Не верыцца дасюль:
я там была?
Слязу на развітанне праліла?

Праз гэткіх плаксаў —
думаю міжволі,
Каб наша Нарач
не займела солі...

* * *

Як бляшанае, лісце грыміць,
Разагнанае ветрам сцюдзёным.
Агалелі каштаны і клёны —
Адступлення святла не спыніць.

Завяршаецца кругазварот
(З-за прыроды мы ўсе фаталісты).
Свет упаў,
раскалоўся
і выстыў,
Як карычневы глянцавы плод.

Дзе ні йду, я заўжды падніму
Найпрыгожшага дрэва насенне,
Што пужліва сцінаецца ў жмені,
Прадчуваючы злую зіму...

* * *

Ля піўзавода пахне соладам,
Ад Свіслачы
ўжо вее холадам,
І марна хоча абагрэць
Увесь прасцяг са Шляхам Млечным
Агеньчык, што названы Вечным.
Дакуль, дакуль яму гарэць?

Патрыятычныя акрасы
Залежаць ад запасаў газу,
І гэта факт, як ні круці.
Вядуць да плошчы Перамогі,
На жаль, не ўсе, не ўсе дарогі,
Якімі крочым па жыцці...

* * *

Дзе лета залатыя міражы?
Яны дасюль нам
мірсцяцца і сняцца.
І так бывае холадна душы,
Што першых ручаін
не дачакацца.

* * *

Пачуцці — хісткая апора,
Ім пастаянства не стае.
Яны, чужыя і свае,—
Любоў, пагарда, скруха, гора —
Душу узрушаць, перавернуць
Ды верхаводкай
                                        сыдуць прэч...
Ім не праціўся, не пярэч —
Стыхія, бач, не знае меры.
Калі ж пакінуць, адшумеўшы,—
Без іх і золь, і пустата.
І там, дзе царствуе Нуда,
Шчэ не ўзышоў
                                        ніводзін вяршык.

* * *

Спярэшчаны палі.
                                        З паўночных схілаў
Ніяк не сыдуць снежныя пласты.
Глядзяць палеткі голыя паныла,
Не высахшы ад талае вады.

Яшчэ не затапіла зелянінай
Ўсё смецце, што пакінута зімой.
Пануе дух вясны гаркава-дымны —
Вясны чарговай,
                                        нашай і маёй,

Такая, як і ўсе,— і не такая.
Ў належны час, чаканая, прыйшла
І добрае
             наўрад ці абяцае,
Акром клапотаў дачных і цяпла.

* * *

Вясна.
Ды холадна цюльпанам.
Не прасыхае парасон.
Не прабуджэнне і не сон.
Смуга.
Ці позна, ці зарана.
Такі ўжо выдаўся сезон.

То прыграе,
То зноў сцюдзёна.
Паміж існую.
На мяжы
Няўтульна, роспачна душы,
Што не жадае быць паўсоннай,
Што існаваць не хоча —
Жыць!

* * *

Не стала глебы пая нагамі.
Такая, бачыце, пара.
Мяне прыціснула гара,
І страхі ў голаў
                    лезуць самі.

Я к пуга — ноч,
                    а дзень імглісты.
Што ні кажы: на дне душы
Заўсёды твань.
                    Не варушы,
Не каламуць —
                    і будзе чыста.

## Цвыркун

Цвыркун у лазні за шалёўкай
Па-цвыркуноваму галёкаў.

Сяброўку клікаў ён, бядак,
Ды не даклікацца ніяк.

Чужыя голыя стварэнні
Зрабілі спёку ў сутарэнні.

Ну проста тропікі, экватар!
І наш цвыркун,
спявак-аматар,

Расстракатаўся у лагодзе,
Нібыта ў лузе пры пагодзе.

А на дварэ і золь, і сцюжа...
Жыццё — адзін падман,
мой дружа...

## Жалобнае

*Памяці бацькі*

Нясці труну — мужчынская работа.
Ўгрызацца ў дол
да зморы і да поту.

Занятак і жаночым ёсць рукам:
Жалобны стол
ладкуецца не сам.

Крыж змайстраваць,
падушачку пашыць
Таму, хто шчэ збіраўся
з намі жыць,

Чыя душа разгублена лунае
І дзе прытулак будзе ёй —
не знае.

**Кал і мы адыдзем.**

Калі мы адыдзем —
застануцца рэчы:
Кнігі, збудаванні
ды рыштунак нечы.
Застануцца рэйкі
разам з цягнікамі,
Кубкі і карціны,
кросны з чаўнакамі.
Ад красунь — пярсцёнкі,
ад шаўца — нажніцы,
Аа машыны — кузаў,
з парасона — спіцы.
Мусіць, не схлусілі:
кожны тут — як госць.
Застануцца рэчы.
Ў гэтым нешта ёсць.

**Саламяны «павук»**

Саламяны «павук»...
Невыносная лёгкасць прасторы.
Залатыя пустоты — ад неба і хлеба, і з іх
Саштукована дзіва:
трохкутнікі, ромбы, узоры...
Галаву задзярэш —
утрапенне, міжвольны уздых.

Незвычайнай такой
не здавалася б, пэўна, салома,
Каб не чутая прымха
пра здольнасці гэтых сцяблоў
Да дзяўчат прысылаць жаніхоў
(самых лепшых, вядома!).
Саламяны «павук»,
я цябе запрашаю дамоў...

**Званок**

Быў тэлефонны — на працу — званок
Ды голас чужы,
што падаўся мне родным.
І радасць змянілася страхам халодным,
Што гэта, відаць,
насланнё, замарок.

Няпраўда!
Праз далеч сігнал прыляцеў,
Што ты не забыўся,
што ты знітаваны
Са мной і з зямлёй,
дзе пупок абразаны.
Ты, можа, сюды тою хвіляй хацеў!

І нехта «агучыў» жаданні твае.
Памылкі бываюць падчас і такія...
Душа скаланутая
ціхенька ные,
А сэрца, надзею займеўшы,
пяе!

* * *

Дзвюх удачаў запар не бывае...
Не сагрэўшыся,
дзень астывае,
Промні нізкія
ў вокнах гараць.
Халадок удыхну, сцепануся
І далей па наезджаным крузе —
Непрыснёныя сны пераймаць.

* * *

Каштана сяміпалая далонь
Варушыць валасы
і гладзіць скронь,
Плячо мае даверліва кранае...
Выказвае прыхільнасць?
Спачувае?

Мо ведае: спынілася на міг,
Пакуль разгону морак не аціх.
Адбілася на момант ад патоку,
І раптам ён, каштан,
адкрыўся зроку.

Давай жа пагаворым тэт-а-тэт!
Коснаязыччам захлынуўся свет
І сам сябе не слухае даўно ўжо.
Даруй і адратуй нас, Божа.

Дай сілу і жаданне далей жыць
Ды час ад часу
з дрэвам гаманіць.

* * *

Птушкі нябесныя — два галубы
Зноў прыляцелі,
сядзяць пры балконе,
Ціха, цярпліва чакаюць, нібы
Век іх карміць буду
гэтак, як сёння.

Ў нашай кватэры між тым нелады:
Клункі з пакункамі,
скруткі дарожак...
У пераезда ёсць прысмак бяды.
З вэрхалу бачацца нечыя рожкі.

Ўсё тут парушана, ўсё дагары,
Дух у кутах не жадае трымацца.
Новыя з'явяцца гаспадары,
Новыя сцены ім, можа,
ўжо сняцца.

А ці пасыплюць зярнятаў калі
Парачцы дружнай —
то нам невядома.
Крупак паелі, вады папілі...
Будзе ім неба настылае домам.

**На сцэне дня**

Рассоўваем мы штору, як заслону,
Выходзячы на сцэну дня
штодзённа.

Хто у галоўнай ролі, хто статыст.
Узнагарода — воплескі і свіст.

Здараецца, як найвышэйшай ласкі
Чакаем мы нябачнае падказкі

Перад рашучым крокам.
І дарма:
Суфлёра аніводнага няма.

Як рэжысёр, кіруе намі лес,
Усмешак патрабуе ён і слёз.

Выкладваемся. Плачам і рагочам.
На сцэне дня
халтурыць мы не хочам.

# Я шукаю на тварах святла

* * *

Мне праніклівасць доля дала:
Я шукаю на тварах святла.
Я шукаю чагосьці такога,
Што з'яўляецца
сведчаннем Бога.

Ды, бывае, не бачу нічога,
Толькі шэрань бяздум'я
і тла.

**Іголкай промня**

Іголкай промня сшыць хацела
Акраец чорны
з мрояй белай.
З гаркоццем — слодыч,
гром з заціішшам
(Сцяблінку ветрык не калыша).
З узлётам —
роспач і падзенне,
З апошнім — першае імгненне...

Я да крыві скалола пальцы.
Ці варта, скажаце, старацца?
Усё, што тут пералічыла,
Само жыццё намоцна сшыла.

* * *

Прадажнасць, як іржа
На вастрыі нажа,—
На душах чалавечых.
А душа,
Калі яна з іржою,
То быць перастае
Душою.

Купляюць
Незнаемых і знаёмых
За малако
(Птушынае, вядома).
Купляюць
За падкову для блыхі,
За кнігу,
За паслугу без чаргі.

Купляюць непадкупных
(Маюць грошы).
Мяне не купяць,
Славе табе, Божа!
Для прайдзісветаў
Вершы не прынада.
Не хочаце аўтографа
Па блату?

* * *

Ў чалавеку
Людское мне дорага.
Я жадаю
Мець чэснага ворага.
Каб не нёс падарункі
Ў мой дом,
Каб у сэрца не шыўся
Вужом,
Не глядзеў каб
У вочы мне,
Быццам сябар найлепшы,
а не
Люты вораг.
Хай тварам у твар!
Хай маланкі
Між гнеўных хмар!
Хай грымоты пужаюць неба.
(Пры варожасці
Так і трэба!)
І -
Ачысціцца небакрай.
Вораг ворагам
Будзе хай!

* * *

Што рабіць мне
з чужою бядой —
З беспрасветнай, як ноч, чарнатой

Тут, бадай, не паможа закон,
Тут не жытка — прытоены скон,
Тут заганы спляліся ў клубок,
Тут замкнута душа на замок
І закінуты дзесьці ключы...
Ты, сумленне мае, не маўчы.
Падкажы,
што зрабіць і сказаць,
Каб глухую сцяну праламаць.
З кім мне раіцца,
чым паступацца,
Каб магло ачышчэнне пачацца?

* * *

Дошкі гонару апусцелі.
Нават з гонарам стала горш —
Ён каштуе сягоння грош.
Прадстаўніча дзядзькі «у целе»
У прэзідыумах сядзелі,
Паважалі сябе.
І што ж?
Ці змянілі свой ход свяцілы,
Ці такі ўжо прыватны лёс:
Спрэс разгубленасць і хаос,
Ні імпэту няма, ні сілы,
Што іграла ў крыві, п'яніла.
Апусціўся паныла нос.

Рабацягі машыны страшнай,
Выканаўцы яе задум,
Вы душу аддалі на глум,
І няшчасныя дзеці вашы —
Спадкаемцы вялікай лажы.
Дык мо возьмецеся «за вум»?

Той пакутуе ў нашым часе,
Хто ў сабе забіваў дабро.
І падвешаным за рабро,
Мабыць, лепей быць.
Хто згінаўся,
Хто апалай лістотай слаўся —
Тых наступнасць збярэ ў вядро.

## Пакаранне

Абыякава
сонца надоечы ўстала.
Абыякава
жонка на стол падавала.
Абыякава
вецер разгойдваў лістоту.
Абыякава
біліся пеўні ля плоту.
Абыякава
рэчка свяціла сінечай.
Абыякавы дзень. Абыякавы вечар.
Каму гэта кара? Каму?
Абы-якаваму

## Набываю ці трачу?

Калі чалавеку чужому
Раптоўна, ў парыве гарачым
Адкрыю душу без развагі —
Я набываю ці трачу?

Калі чалавека чужога
Давер'ем сваім перайначу,
Калі не шкадую пяшчоты —
Я набываю ці трачу?

Калі, чалавека згубіўшы,
Слязамі маўклівымі плачу,
Сябе выпрабоўваю болем —
Я набываю? Трачу?

* * *

Душа павінна вызваляцца
Хоць раз у месяц, раз у год
Ад мітусні
                    штодзённай працы,
Ад надакучлівых клапот
Пра дом, пра посуд, пра калготкі,
Мыццё бялізны, хлеб, абед...
Душа на нейкі міг кароткі
Падобнай стане на Сусвет —
Дзе неабдымная прастора,
Дзе супакоены хаос,
Дзе свепяць урачыста зоры
І не баяцца вочы слёз.

**Ранішні верш**

Прамень абход свой пачынае
З пакоя,
          дзе дачка малая
Ружовай ручкай ловіць сны,
Дзе затаіўся змрок начны
І цацкі спяць.
                    Там пагуляўшы,
Прамень на стол пісьмовы
                                        ляжа.
Асветліць нітачку радка
З даўнейшага чарнавіка,
Заўважыць кнігі на акне,
Прымусіць жмурыцца мяне...
У поўдзень ён цікаўнай пыскай
У кубкі лезе, лезе ў міскі,
Глядзіць: бабуля дастае
Буханку,
                    рэжа на стале...
Заўсёды так.
                    Але з гадамі
Дачка расце, сталее мама.
Але бабуля нестарая
Аб маладосці уздыхае.
Усе мы новыя штодзень.
...Да новай раніцы, прамень!

* * *

Дзіця пераступае ганак,
Ідзе само асвойваць свет.
На шыі звязка абаранкаў
І малака на губках след.

І як шкада,
                    што праз хвіліну
Міне запылены «Масквіч»
Такую мілую карціну.
...Ды застанецца —
                              кліч не кліч

У паўзабытым вымярэнні,
У вёсцы, дзе пятнаццаць хат,
Маё жывое шчэ карэнне
Ды мой расчулены пагляд.

**Памяці дзядулі**

Так асцярожна
Зямельку ты браў у жменю —
Бы птушаня,
Якое лятаць не ўмее.
Глядзеў на яе уважліва.
Вось гэтак глядзіць вучоны
У кнігу,
Каштоўную мудрасцю.
Сціскаў камячкі вільготныя,
І долу цяклі скрозь пальцы
Нябачныя промні сонца...

Не ведаў ніхто, дзядуля,
Што ўвосень
Сырой зямелькай
Засыплюць твае далоні
Так асцярожна.

* * *

Сустрэла суседку
з кватэры былой.
Зусім не сяброўку,
а проста суседку,
Дзесятка гадоў маіх
блізкую сведку.
З прыпынку
махнула ёй ветла рукой.

А сэрца так сціснула,
так апякло,
Як быццам гадоў тых
бясплотныя здані
Належаць па праву
ўжо мне перасталі,
А збеглі туды,
дзе старое жытло.

Ім вечна глядзець
на пакінуты двор,
Дзе грушку трасуць
і збягаюцца дружна
Дзіця і жанчына,
стары і нядужы —
Збіраюць, хапаюць
няспелыя грушы,
А дрэва нічыйнае
сее дакор.

* * *

Па моцнаму марозу, адвячоркам,
праз лес, закуржавелы і маўклівы,
наведалася маці да мяне.
Сказала, распрануўшыся:
«Паслухай,
пра што, йдучы, я думала.
Дык вось:
сярод усіх істот
найбольш безабаронней
і бяскрыўдней — дрэвы.
Не маюць ні зубоў, ні кіпцюроў,
ні ног, каб ад пажару уцячы,
ад буры, ад навостранай сякеры.
Растуць, шумяць —
то радасна, то смутна...»
А мне здавалася,
што быў расказ яе
цудоўнейшай
з усіх паэм на свеце.

**Мастачкаю была б.**

Мастачкаю была б —
намалявала б
жанчыну маладую.
На каленях
ляжыць дзіця — ружовенькі галыш.
(Яго б я запазычыла знарок
з палотнаў Рафаэля,
а жанчыну
з суседкі змалявала б
ці з сябе.)
Адзення колер цёмны.
У руцэ
з-пад малака бутэлечка бялее.
У позірку — пытанне.
За спіной
ракет увыш нацэленыя дзюбы.
«Мадоннаю XX стагоддзя»
назвала б я карціну.
Ну, а вы?

* * *

На возе з бітонамі —
мажная целам,
Тварам ружовая —
баба сядзела.

Каня падганяць не хацела яна.
Хораша ж надта, кругом ярына.

Кінула погляд далека, высока.
Спёка і сінь, зяляніна і спёка...

І воз серабрысты паўзе неахвотна,
Нібы самалёт
у пачатку палёта.

## Яна купляла гладышок

*Памяці Алы К.*

Яна купляла гладышок
З чародкай кубкаў.
Глядзела зблізку і здалёк,
Узяўшы ў рукі.

Ізноў круціла так і сяк,
Лічыла грошы.
Ажно свяцілася уся:
— Які харошы!

Ішла з пакункам дарагім,
Твар ветрык лашчыў,
І не зыходзіўся зусім
На стане плашчык.

* * *

Ішла і плакала жанчына.
Ці маці страціла, ці сына —
Не ведаю.
Хапае ў свеце бед!
Чым перад ёю правініўся свет
На гэты раз?
Як мы усе,
Яна пракляцце вечнае нясе —
Ад Евы
да сучасных нашых еў,
Што дзічкі рвуць
з усіх бліжэйшых дрэў.

Ішла і плакала...
Ні мала
Свайго адчаю не хавала.
Не заўважаючы людзей,
Дасюль яна ідзе-брыдзе
Перад маім душэўным зрокам,
І выглядаюць цёткі з вокан.

* * *

У магазіне, дзе таўпяцца
Да закрыцця,
дзе модніц рацъ,
Нямая, ўказваючы пальцам,
Прасіла штосьці паказаць.

А прадаўшчыца раздражнёна
Ёй падавала зноў і зноў
Кулон, значок, фігурку з лёну,
Затым драўлянае пано.

Пры гэтым лаялася злосна,
Аж пабялеўшы: гэта? не?
Нахабства ўскручаныя восы
Кусалі моцна
і мяне.

Мне б заступіцца за жанчыну,
Ласкавы Бог мне даў язык!
А я пальчатку камячыла.
Я прамаўчала. Голас знік.

Дасюль
над той хвілінай чорнай
І над сабою суд вяршу.
Мычыць пакутліва мой сорам
Ды пальцам торкае
ў душу.

**АРЭХ**

Прыгожа гаварыць
Ён мае завядзёнку.
Ён здаравец,
Сабой не абы-які.

Не чалавек — арэх:
Крамяны, моцны звонку.
Раскусіш — чарната,
І зернятка
Ні знаку.

* * *

Душу паволі вытанчаць пакуты,
Сляза адбеліць,
загартуе боль.
Хто ўчора быў зняможаны і скуты,
Нарэшце памяняе сцэну й роль.
Усё, што пражыта — і пазбыта,
А што займелі, тое беражом.
У звадку
між бяссмерцем і нябытам
Уцягнутыя —
трудненька жывём...

**Сапсаваны гадзіннік**

На гадзінніку стрэлкі застылі,
Пад гадзіннікам
людзі снуюць.
Пэўна, кажуць сабе:
не забудзь
Тое й тое...
А сутнасць — забылі.
Хто забыў,
хто не помніў ніколі,
Хто атручаны зеллем і спіць.
І над нашай агульнаю доляй
Сапсаваны гадзіннік вісіць.

* * *

Як вогнішча прыцягвае пагляд,
Так і яны, царкоўныя званіцы.
Шкада, што не навучаны маліцца,
Атэістычны ачмурыў нас чад.

Умець бы з Усявышнім размаўляць,
Пераадолець лад косная́зыкі.
Шкада, што суайчыннікі прывыклі
І цяжка жыць, і цяжка паміраць.

Захоплена галовы задзіраць —
І прэч, далей,
                    да сварак і разлікаў.

* * *

Пакуль грахі не выгарань датла,
Палаць агню
                    і звыкла пахнуць серы.
Што чалавек без людскасці і веры?
Без зерня колас, лямпа без святла.

Задуманы няблага, за вякі
Расчараваў Тварца неверагодна,
Гатовы павярнуць куды заўгодна
І ўзяць падачку з бруднае рукі.

Да прорвы ідучы —
                    за крокам крок,—
Грашыць самазабыўна і заўзята.
Не адчувае, што пячэцца ў пяты,
Ён для сябе самога не прарок.

А ўжо для іншых...
                    Што тут гаварыць!
Шкадуй ці бойся —
                    ён і не прыкмеціць.
Прадасць каханне, выpадка прывеціць
І ад сівухі да Суда згарыць.

* * *

Мы ўсё зразумеем —
Хто сёння, хто потым,
Такую мажлівасць
нам доля дала.
Не кожная завязь
Становіцца плодам,
Ды плод пажаданы —
бо квецень была.

* * *

Не можам ведаць,
што заўтра будзе.
Не можам ведаць,
што скажуць людзі.
Не можам вылічыць
дні і ночы,
Калі падмануць,
калі сурочаць.
І тыя крокі
нам невядомы,
Што варажнечу
пасеюць дома.
Адно па сутнасці
застаецца:
Прымаць, што ёсць,
і пытацца ў сэрца.
Свой шлях зямны —
пакручасты, цесны —
Звяраць па роўных шляхах
нябесных.
Куты апырскаць
святой вадою,
Прайсці па кладачцы
над бядою...

* * *

Паспела герань расцвісці,
А кактус
пакуль не збіраецца.
Паболела сэнсу ў жыцці,
Я знаю, куды мне ісці.
Чаму ж перашкоды
страчаюцца

Бывае завалены шлях
Калодамі,
робіцца гразка,
Нядобры расходзіцца пах,
І ты для стаўка — як замах
На ўтульнасць яго
і на раску.

Запруда не любіць вады
Праточнае —
рэч зразумелая.
Імклівасць не церпіць нуды.
А як сутыкнуцца — тады
Варожасць,
якой не хацела я...

* * *

Пастукаю ў суседнюю душу,
Пачую насцярожанае:
«Хто там?»,
І вызірне на хвілю адзінота,
І я нялоўка солі папрашу
Альбо запалак...
Болей — не пасмею.
Сябе ж не прапануеш у сябры,
Маўляў, вось я,
прыгледзься і бяры,
Маўляў, я не прадам, я зразумею.
Ад холаду сцінаецца нутро,
А любасць непатрачаная плача
Па тым, хто зачыніўся, як гарлачык,
Маўкліва адвяргаючы дабро.
Чужога блізка ён не падпускае,
Ў сабе самім замураваны спрэс.
А я ўсё стукаю.
Я не жадаю без
Супольнасці!
Без дружбы — не жадаю

* * *

Сышоў вячэрні морак з вышыні,
Прыхоўваючы ўсе непамыслоты.
Свіцяцца электрычныя агні,
І гмахі шматкватэрныя —
як соты.

У гэтых сотах — жыцці, а не мёд.
Тут бруд і цнота,
шчасце і пакута.
Злучылі нараджэнне і зыход
Нябачныя — з трывалых самых —
путы.

Тут пчол і трутняў дзіўны сімбіёз,
Свае законы і свае парадкі.
І той, хто сёння ўзятак не прынёс,
Гарланіць песню
ды пужае матку.

**Быль пра бабку Паўліну**

Ўсю зіму — быў мароз такі —
Наша бабка жыла ў дачкі.

Да лістоты, да першага грому
Выязджала яна дадому.

Адамкнула — і цяжар з плеч!
Прапаліла перш-наперш печ.

Каб на старасці цешыўся зрок,
Пасадзіла ў бляшанцы бабок.

Каб не быць без работы, да ладу
Давяла і садок, і грады.

Неўзабаве на дворыку вузкім
Захадзілі паважныя гускі,

Ну, а потым (пазычыла грошай)
Парсючок паявіўся харошы.

Хай злуюцца дачка і ўнукі —
У бабулі не зломкі, а рукі!

У каморку пайшла па хлеб...
Дый упала.
І свет аслеп.

У дачкі, што бялізну мыла,
Сэрца ёкнула і заныла.

Сцяўся, гора пачуў вазон:
Пагубляў свае кветкі ён.

У разоры наліва, антоны
Сталі сыпацца градам зялёным.

Вокамгненна, прыждаўшы часіну,
Паабсела куты павуціна,

А на двор (за якія грахі?)
Пацягліся гужом лапухі.

З лапухоў тых узмахам кароткім
Вылялі не гускі — лябёдкі.

Парсючок праз варотцы пралез
Ды пабег, адзічэўшы, у лес...

І слязьмі, што па ёй праліты,
Нашы ночы і дні абмыты.

**Быль пра голага**

Выпаўзаў з-пад крывавых цел,
Чуў апошнія нечыя стогны.
Бег ад ямы — бялей, чым мел,
Тварам быў і не ведаў стомы.

Падаў, плакаў, спяшаў туды,
Дзе міргае агеньчык кволы.
Чалавек уцякаў ад бяды.
Па апалай лістоце. Голы.

Ён аддыхацца ўсё не мог,
Калі стукаць пачаў у акенца:
— Дай ты мне, напрамілы бог,
Гаспадынька, хаця адзецца.

Паглядзела, як апякла.
Шмарганула хутчэй фіранку.
Асцярожнай, відаць, была.
Начаваў чалавек на ганку.

Ён запомніў дарэшты ўсё —
І гародчык, і дом, і грушу,
А назаўтра дастаў рыззё
У суседзяў.
Спыніцца мушу.

Праз гады пераскочыць верш.
...У бастонавай пары новай

Завітаў чалавек
і перш,
Чым знайшліся якія словы,

Ёй у вочы зірнуў. Яна
Мітуслiва фартух здымала.
І стаяла ля іх вайна —
Выскалялася, рагатала.

Чула ўсё, што не чулі мы,
Ды падміргвала нам заўзята.
І грымелі яе грамы
Ў небе ясным пяцідзесятых.

...Недарэчна пабегла ўслед,
Спрабавала тлумачыць штосьці...
Асыпаўся з ігрушы цвет.
Датлявалі за вёскай косці.

## Маналог кактуса на падваконні

Для жыцця мне хапае святла.
Абыдуся без вашай увагі.
Мне пустыня цярплівасць дала
І дала незалежнасць ад смагі.

Не прысніцца мне ўночы вала,
Так, як вам — вашы дзённыя мроі.
І што брыдкі сабой — не бяда.
(Прыйдзе час любавацца і мною.)

Я суседзям не брат і не сват,
Што ў пашане.
Ды Божа мой мілы:
Хоць адзін бы пяшчотны пагляд!
Каб істота адна палюбіла!

Вам бы ведаць, як цяжка ўва мне,
Як жадана, ўрачыста (бо рэдка)
Выспявае... прарастае... Не,
Праразаецца першая кветка!

Даастатку ёй сілу аддам
І смак перамогі спазнаю,
Калі раніцай ахнецца вам:
— Паглядзіце!
Ды ён расцвітае!

## Маналог паўднёвага дрэва

Я скінула кару.
Я вызваленым целам
З вясною гавару —
Я гэтага хацела.
Зласліўцы, мне начхаць,
Што неяк не прынята
Вам сутнасць адкрываць:
Я быць сабою рада!
Не скура на камлі
(Назвалі бессаромным) —
То звісла да зямлі
Ашмоцце забабонаў.
То даўнасці маёй
Каравае аблічча,
Што трызніць чысцінёй
І вызваліцца кліча.
Даўжэй, святочней дні.
Расту я вышай, вышай,
Значэнне вышыні
Сваёй усведаміўшы.
Прыморскі любы край
Як на далоні бачу.
Мне пазайздросціць хай
Той, хто жыве іначай,
Хто цешыцца прывык
Апольцам існавання.
Вы — шэпт,
я — звонкі крык,
Які падхопіць ранне!

## Жаўна

Сядзела каля вулея жаўна,
І пчолак, абцяжараных узяткам,
Немітуслівa склёўвала яна —
З вялікім апетытам,
па парадку.

Жаўна, скажу вам, прагнаю была,
Бо добра згаладалася за весну.
Ды нейкая чарговая пчала
У горла не пайшла ёй,
не палезла.

Задумалася птушка:
як тут быць?
«Няхай жыве»,—
сказала і ўздыхнула,
Яна цяжар вялізазны нібы
У гэты міг з душы сваёй спіхнула.

...О дабрата, няма табе цаны!
Ты — госця сфер вышэйшых,
запаветных.
Ты нават паслядоўніка жаўны
Узвысіш —
да наступнага абеду.

## Дзічка

— Зрабіце мне хоць крышачку дабра,—
Прасіла груша-дзічка пры дарозе.—
Я вам аддзячу,
я свой чэзлы плод
Ўзрашчу вялікім, сакаўным і жоўтым.
Пераўзыду — паглядзіпе! — сябе,
Удасканалю ўласную пароду,
Калі чыясьці рупная рука
Абрэжа, паліе і абкапае.
Я вам алдзячу!
...Ды каторы год
Праходзяць, праязджаюць людзі міма,
І трушчыцца пад колам і нагой
Нікому не патрэбнае маленне.

## Грыбніца

Счарвівеў грыб, не вырасшы.
Бывае.
Грыбніца рукі белыя ламае.

У чым яе, гаротніцы, віна?
Дзяцей гадуе, ведама ж, адна.

Малодшанькі на выгляд хоць куды.
Пашэнціла — пазбег скаварады,

Схаваўся пад лісточак (малайчына!),
Калі грыбнік тут віжаваў вачыма.

Дужэў ён і надзеі падаваў...
І раптам... Вось...
Што сіта галава.

Цяпер ні навучацца, ні жаніцца...
І ціхенька усхліпвае грыбніца.

**Лялька**

*Доктару Я.*

Дык што там у лялькі
Ўнутры?
На выгляд яшчэ не старая.
(Што сцерлася фарба на шчоках
Не болей чым дробязь, дэталь.)

Дык што ж унутры?
Характэрна,
Што лялька сама не жадае,
Каб поркаўся нехта ў вантробах,
Узброены Фрэйдам і К°.

Дык што там?
Ці так ужо важна
Даведацца вам пра начынне.
Апілкі ці штосьці дарагое —
Без розніцы.
Толькі б жыла.

Смяялася і суцяшала,
Задумліва ўдалеч глядзела,
Каб добрыя сны заляталі
Ў галоўку льняную...
Дык што?..

* * *

Пад нагамі галінка мімозы.
Гэта ж свята заўчора шумела,
Нас хоць трошкі
суцешыць хацела,
Пацалункамі высушыць слёзы.

І дарма:
ёсць палёгка у плача.
...Ды хавае раптоўную слабасць,
Хто узнёсся і выпесціў самасць,—
Ён не можа, бадай што, іначай.

Ў ганарлівасці пыхі багата.
Ганарлівы прыцягвае злога.
І калі забываеш пра Бога,
То *ад нас*
не ратуе нас свята...

* * *

Як цяжка ўсходзіш ты,
насенне
Маёй душы!
Калі ты ўпала на каменне —
Яго скрышы.
Калі патрапіла у хвалі —
Не патанай.
Калі снягі цябе схавалі —
Вясну чакай.
Калі ж засохла ты
ці, можа,
Груган склёваў —
На што жыву?
Нашто, о Божа,
Іскра твая?

## Я гляджу на сябе

Я гляджу на сябе, на сябе —
Якой я калісьці была.
Чупрынка свіціцца на лбе,
На твары — ўсясілле святла.

Я гляджу на былую сябе
(Сто мяцеліц той час замяло!),
Варажнечы і ростаняў збег
Азмрочыў і твар, і чало.

Шкадаванне мне сэрца дзяўбе:
Дзе даверлівасць?
След яснаты?
...Я гляджу на сябе, на сябе.
На сябе глянь, мой дружа,
і ты...

## Старыя здымкі

Старыя здымкі драць —
Судзіць і дакараць
Уласную каштоўную персону.

Увага! Забароненая зона!
Сюды не падступіцца мне самой.
Тут час, які застаўся за спіной.

У добрым ладзе тут
і ў добрай згодзе
Дзесяткі «я» маіх стаяць і ходзяць.

Адна — само давер'е і дабро.
Другая выбірае словы злыя.
Дзе цвёрдая — Адамава рабро,
Дзе слабая...
І ўсе яны — былыя.

З сабою разам тых я падзяру,
Каму дарэмна сэрца давярала,
Каго, не разглядзеўшы,
угару,
У зорныя вышыні узнімала...

Абрыўкам не ўваскрэснуць,
не злучыцца.
Падраць — лягчэй.
Цяжэй — не паўтарыцца.

## Равесніца

*Наталлі Ч.*

Равесніца, ты для мяне люстэрка.
Ўзіраюся з уважлівасцю дзіўнай,
І кожненькая рысачка на твары
Дрыготка адгукаецца ўва мне.
Было б прасцей,
калі б душа старэла
З яе часовай знешняй абалонкай.
Гармоніі паболела б у свеце,
Паменела б гаротных, не інакш.
Яшчэ ў вачах паблісквае агеньчык,
І пругкасці не страціла паходка,
І столькі спраў за дзень ты пераробіш,
Што вечарам не верыцца самой.
Уночы прыйдзе першы сумны веснік —
Бяссонніца.
Ты доўга гаварыцьмеш
Пра клопаты бясконныя ды спрэчкі,
Пра нешанцунак (з ёю ці з сабой?),
Пра ўсё, пра ўсё...
(Трымціць струною цемра.)
Ды ёсць адно,
пра што ты не раскажаш
І што змушае часам азірацца
На вуліцах унураных мужчын.
Равесніца! Дагэтуль прага шчасця
Жыве ў табе, а сэрца пратэстуе
Супроць неміласэрнага закону,
Якому падлягае чалавек...

**Быў сон...**

Быў сон: дзве свечкі залатыя.
Ды не падобны свечкі тыя.

Адна па ўсенькай даўжыні
У пералівістым агні.

Яна трапеча і зырчыць,
Здаецца — век не дагарыць.

Ну, а другая — не такая:
Гарэць не хоча,
                              ледзь міргае.

Мо ёй паветра не хапае?

У ёй, што воскам слаба плача,
Сябе я ўчорашнюю бачу.

* * *

Узрост выцясняецца ўзростам,
Складаная ісціна — простай.
Імкненні —
                              выгодай куртатай,
Рашучасць —
                              пытаннем «Ці варта?»

Усё, што не супрацiўляецца,
Адмоўем сваім выцясняецца.

* * *

У зялёным небе жніўня,
Небе золкім, вечаровым,
Як на стозе — на аблоку
Стома-матухна сядзіць.

Аглядае гмахі, хаты,
Сон на вейкі пасылае
І з бліжэйшае хмурынкі
Мару думае спіхнуць.

Тая ж сыпле на абшары
Летуценні поўнай жменяй.
Не зважае на суседку —
Годнасць ведае сваю.

Стома з марай варагіні
Ад пачатку, мабыць, свету.
У іх адвечнае змаганне
Умяшана сёння я.

Як магу, перамагаю
Сон спакусны, неадольны.
Мне б адзіны хоць лятунак,
Як бывала, улавіць...

* * *

Людзі, адграбайцеся ад зла.
Самой мне гэта рэдка удаецца.
Бывае так,
                                    што камянее сэрца
І не стае вачам маім святла.

Але мінае
                                    чорны момант той,
Ўсясільны промень
                                                  хмары расхінае.
І я тады ад светлых слёз сляпая,
І цэлы век
                                    жадала б быць сляпой.

Атулі мяне ласкай сваёю —
Як шчытом, ад бяды заслані.
Накіруй на дабро мае дні,
Хіжых, помслівых прагані,
Памажы не мірыцца з маною.
А як грэх мяне зможа
і збрудзіць,
Як на сцежках жыцця заблуджу —
Пакажы мне і край, і мяжу,
Адратуй і ачысці душу,
І бялейшай за снег
яна будзе.

# Асенні мёд

*Лірычная драма*
*ў 3 - х дзеях*

## *Пралог*

* * *
Давай адгародзім кавалачак раю,
Ўсяго толькі дзялачку,
лапік які,
Дзе будуць не восы лятаць —
матылькі —
Ды кветкі цвісці невідочныя з краю.

Навокал варожасць,
а з намі — лагода,
І вусны да вуснаў, і рукі да рук.
Для нас будзе ростань
найбольшаю з мук,
А горам — адсутнасць
сумоўя і згоды.

Сюды не прабіцца чужому пагляду.
Тут наша дзяржава,
тут наша мяжа.
Тут наша адзіная сёння душа,
А цені ўчарашнія хліпаюць ззаду.
Чым заўтра абернецца райская ява —
Не дадзена ведаць.
Самотай? Слязьмі?
Мы сталі не першымі, зрэшты,
людзьмі,
Каго напаткала такая праява.
*7.07.1991*

## Дзея I

## РАЙ

* * *
Прытушы пагляд свой, любы,
Веі апусці.
Гэтак можна і да згубы
Удваіх дайсці.

Бо як побач, бо як блізка,
То ніякі шлях
Не падасца дужа слізкім.
І пры чым тут страх?

Усё, што суджана, мы пройдзем.
Крыва не ступну.
Палюляю пры народзе
Дзіцятка-віну.

Хай настрояў пералівы
Льюцца праз край,
Толькі свой пагляд шчаслівы
Ўсё-ткі прыхавай.

### Брама

Браму, што замкнутай іржавее,
Ці адчыніць рагітам райскі сад?

Так ці не —
апушчаныя веі
Мне сказалі болей, чым пагляд.
Яблычак біблейскі на далоні —
Адкусі кавалачак, прашу.
Горыч будзе потым, а сягоння
Свята перапоўніла душу.

Зазіраць у заўтра небяспечна.
Пруткая і тоненькая ніць
Нас злучыла, пэўна ж,
не навечна
І часамі роспачна трымціць.

* * *

Аслепнуць на момант —
і ўзняцца ўгару,
Расправіць учора адсутныя крылы…
Смугою крыві, што мяне асляпіла,
І прагай душы
я з табой гавару.
Табе раскажу я
(ці ўважлівы ты?)
Не словам, не вяззю ціхуткай размовы
Пра ўсё, чым жыла,
што не змесціцца ў словы,
Што сутнасцю стала маёй
назаўжды.
Сказаць і пачуць —
гэта шчасце, бадай.
Адчуць невыказнае —
дар невыказны.
Сустрэну пагляд твой,
лагодны і ясны,
І ў ім патану, як у квецені май.

* * *

Дзе навальніца — там і пажар.
Я не баюся.
Ты пакаранне мне а ці дар —
Не разбяруся.

Ці то мне дзякаваць,
Ці дакараць
Боскую волю,
Ці сваё сэрца рашуча суняць:
— Хопіць! Даволі!..

Зрэшты, я неяк параджуся з ім,
Ўсё ж не чужыя.
Што ж мы хвалюемся так
і трымцім,
Быццам малыя?

* * *

Пячаткай зямною
зацверджана тое,
Што недзе гадамі плялося і спела,
Ляпілася,
яваю стацца хапела —

Яшчэ невыразнае, ды трапяткое.
Асвечана смехам,
слязою абмыта,
Прамоўлена словамі без крывадушша.
І я спадзявацца,
укленчыўшы,
мушу,
Што ў гневе не будзе нябесная світа.

* * *

Ісці ды усміхацца –
вось раскоша!
І ноч была як ноч,
і дзень харошы.
Учорашняе змрочным
не здаецца,
А будучыня
хітранька смяецца.
Што мне яна рыхтуе —
не пытаю.
Я гэты міг
істотаю ўбіраю.
І звязаная з небам,
як антэна,
Усіх люблю
і цешуся праменна.

* * *

Як людзі у свеце
знаходзяць адзін аднаго?
Чыімі рукамі
сцяжыны сустрэчныя
ткуцца
Надыдзе хвіліна —
і нашыя сцежкі сплятуцца,
І зродняцца сэрцы,
і вусны уславяць Яго.

**Юр'я**

У нас сваё летазлічэнне —
Не ад народжання Хрыста.
Быў дзень святла і хараства,
І зваўся Юр'ем дзень вясенні.

Спявалі цёткі ў вышыванках.
Званочкі продалі, свісткі.
Быў дзень праяснены такі
І незвычайны нейкі зранку.

Гуляў са стужкамі вятрыска,
Снаваў ля Белай Дачы люд...
Пачатак новай эры тут:
Ты падышоў —
і стаў мне блізкім.

* * *

Я слухаю цябе, як жаўрука,
Калі гамоніш

складненька і гожа.
Кал і з рукою
сплецена рука —
Нішто мяне са шляху
збіць не зможа.
Гармонія вяртаецца у свет,
Дзе столькі без карысці
зруйнавана.
І шчасце ўжо
не цацачны макет,
А годны гмах,
дзе жыць наканавана.

* * *

Снег усё падае і растае,
А я на вусны гляджу твае.

Чаму, лагодныя, сталі крывіцца?
Тваёй нязгоды мой смех баіцца.

Ад непрывету
пчалой ад ночкі
Мая пяшчота бяжыць упрочкі.

Адно ў такіх выпадках суцяшае:
Каб без хмурынкі — так не бывае.

Сонца абрыдла б,
спёка — ссушыла...
Да панядзелка, злоснік мой мілы!

* * *

Калодзеж зусім не бяздонны.
Глядзі, спаталяючы смагу,
Каб нейкаю хвіляй нядобрай
Не чэрпнула глею вядро.

Хай сочыцца вільгаць з прадоння
Ды зруб запаўняе сабою,
Каб зорка магла падфарсіцца
І хмарка чубок прычасаць.

І ты, нахінуўшыся, згледзіш
Не жаласны бляск змізарнення,
А годную гладзь люстраную
І сонечны твар свой у ёй.

* * *

Як выглядвае сонца — для нас.
Як сцішаецца вецер — таксама.
Лагаднеем і мы у той час,
Забываем прыватныя драмы.

Ёсць хвіліны — сама дабрыня,
Іх няможна мінаць без увагі.
А сустрэнеш такую між дня —
Быццам трапіш у горнія гмахі.

Што з таго,
што не выпала жыць?
Мы там госці, а госцю — пашана.

Спасцігаем навуку любіць,
Цараваць без належнага сана.

...Памаўчалі — рука да рукі,
Разышліся,
а сонца — у душах,
Каб маглі выдзіраць асцюкі
Ды вытрымліваць новыя сцюжы.

* * *

Напэўна, гэта атавізм,
Насмешкі варты перажытак —
Хоць зрэдку чуць тваё «люблю»
І заміраць удзячным сэрцам.

Я і не чуючы жыла б.
Мне ўсё вядома без прызнанняў,
Ды вось жа прыхамаць адну
Перамагчы не маю сілы...

* * *

Як рака на лузе завіваецца,
Так настрой
майго каханага
мяняецца.

То ласкавы ён,
акрылены без меры,
То зняверапы,
як раб каля галеры.

То, шануючы,
да зорак узвышае,
То калючкамі і коле, і кусае.

З усяго зрабіць я вывад мушу:
Ён мяне кахае
толькі дужай.

Толькі ўпэўненай і годнай валадаркай,
Што з душою
поўнаю, як чарка.

Вось і буду я такою,
вось і буду —
На дзіва Богу,
і сабе,
і люду!

* * *

Мне кожны дзень —
як падарунак
І нават горыч за ласунак,
Такі вось дзіўны
час настаў.
Мяне дзівіць ён перастаў.
Каб не сурочыць —
не хвалюся
І толькі позіркам смяюся.

Хто я?

У космасе — пылінка,
На лузе чэрвеньскім — былінка.
Далекавата шчэ каса.
Пераліваецца раса.

* * *

Дзе любові мяжа,
дзе мяжа забыцця,
За якою ўжо страта сябе
і не меней?
Жыву я адной палавінкай жыцця,
Калі ты ў аддаленні.

Ды і тая кідаецца,
нэндзіць,
шчыміць,
Бо не мае прытым неабходнага гарту.
Ды і тая
згадзілася б лепей
не быць,
Чымся быць без цябе
так багата.

* * *

Ты сярдзіты быў, каханы,
Што я з'ехала далёка,
Што твайго унікла вока —
Ты сярдзіты быў, каханы.

Папрашу я даравання
За правіннасць за такую.
А не то з віной звякую,
Як не будзе даравання.

А пакліча да адказу
Недаруючая сіла —
Ад кажу:
— Ён даў мне крылы,
І мы на небе будзем разам.

**Згадка**

Кружыла згадка блізка-блізка,
А потым пырхнула ўзяла
Ды паімчалася, як пліска,
Аж да заходняга еяла.

Збіраў ты росныя апады,
Пасля з раднёю бульбу браў.
Такі ў нядзельку быў заняты,
Што згадку-пліску не пазнаў.

Яна лятала у гародзе,
Цікаўным вочкам
бліск ды бліск,
Каб зноў азвацца пры нагодзе —
Як ад'язджаць збярэшся ў Мінск.

* * *

Як чаранок да галіны ўвеску —
Гэтак прывіты
Ты да мяне, мой балесны,
Мой непазбыты.

Знаем, як гэта завецца,
Спраўджаны мроі.
Разам пад сонейкам грэцца
Будзем з табою.

Разам трываць мем задуху,
Сівер сцюдзёны,
Самую чорную скруху,
Клопат будзённы.

А як расстання сякера
Ўзнімецца грозна —
Зросшыся цесна, звыш меры,
Скажам ёй: позна!

**Дзея ІІ**

**АПРАМЕТНАЯ**

* * *

«Нашто ты мяне палюбіла?» —
З усмешкай, з папрокам нібы.
Як быццам я першай адкрыла
Пагляд невідушчы, сляпы.

«Нашто ты мяне палюбіла?»
А як я магла не любіць,
Кал і неадольная сіла
Цягнула пераступіць
Мяжу, за якою — бяздонне
Ды рызыка страцінь сябе?..
І мука, як дзяцел, сягоння
Мне сэрца дзяўбе і дзяўбе.

Нічога яшчэ не забыла,
Залежаць, аднак, не хачу.
— Нашто я яго палюбіла?! —
У шэрую вышу крычу...

* * *

Сонца вісела між двух дамоў,
А мы на лязе прамяністым стаялі,
Потым кудысьці брылі па спіралі...
Гутарка, смешачкі, зборы дамоў.
Нам бы яшчэ памарудзіць крыху

Ў вузкай палосцы між сцюжай і сцюжай.
Нам бы сагрэць ацалелыя душы,
Толькі прасвет той вярнуць не магу.

* * *

Ад заляцанняў да спазнання,
Да спатлалення, да з'яднання.
Да звыкласці, да адкрыцця,
Што ўжо няма сэрцабіцця.
Да непралазнае сцяны
Неразумення і маны.
Да болю даўкага, да путаў,
Да слодычы, што як атрута...

* * *

Бінты ад раны адрываць,
Марудзячы,—
такая мука!
Добраахвотная прынука —
Бінты ад раны адрываць.

Ўсяму свой тэрмін
і свой час:
Хварэць, а потым папраўляцца,
Каханай быць,
каханкай звацца.
Ўсяму свой тэрмін
і свой час.
І ўсё ж —
спакойна не магу
Прымаць нямілае збавенне.
І марны сон, і прабуджэнне
Прымаць бясстрасна не магу...

* * *

Атуленай была і захінутай,
Хоць неяк адгароджанай ад зла.
Той час мільгнуў,
як зыркая мімута,
І зноў густая цемра пацякла.

Не цемра нават —
шэрань без прасвету,
Дзе рэха тоне і канае гук.
Блукаю я
па гэтай апраметнай
І выбрацца да сонца не магу.

Сюды вяла падманутая вера.
А думкі і настроі — як сычы.
І ўсё, што пеpажыта
*ў нашай эры,*
Мне ані ў чым
не можа памагчы.

* * *

Ў горадзе вецер
і сыпле крупой.
З ветрам кудысьці

панёсся спакой.

Удзень я трываю
напятай струною,
А ўноч — чорны смутак
валодае мною.

Круціць, і трэпле,
і жорнамі меле,
І ў пыл рассявае
па шлюбнай пасцелі.

Як толькі за шторай
бярэцца світаць —
Сябе не магу я
у жменьку сабраць.

Ды часам, прызнаюся,
і не ахвота:
Навошта мне
марная гэта работа,

Калі ты счужэлы,
калі ты не мой,
Калі — як за нейкай
кітайскай сцяной?..

* * *

Прасіла горкай праўды.
Ўручылі мне адну
У срэбранай абгортцы
Салодкую ману.

Праз гэтую праяву,
Праз крыўду
і праз боль
Пасолена падушка,
Ды і на сэрцы — соль...

* * *

Прадаў каханне.
Гэтакай бяды!
У свеце ўсё разліку падлягае,
Была б урэшце выгада якая
І каб сухенькім
выбрацца з вады.

Не раз выходзіў.
Словы рассыпаў,
Як пацеркі шкляныя,
як бразготкі,
Чый век і зіхатлівы і кароткі.
Даваў ману — пяшчоту забіраў.

Дык што мы маем?
Рысу падвядзём:
Ты юдаў брат,
а значыць,
мне не сябра.
Шчупак на сушы раздзімае жабры,

І раскай зацягнула вадаём.

**Дакор**

Што, ўжо не маеш на донцы душы
І кроплі адной,
каб са мной падзяліцца
Гэта нязвыклае слова — «чужы».
Мо яно сніцца?

Згадак бязгрэшных не варушы.
Грэх толькі там, дзе парушана мера.
Гэта нядобрае слова — «чужы»,
Няма яму веры.

* * *
Я адцаляюся, адыходжу.
Бачу сваю спіну
ў клетчатым паліто.
Думка адна свідруе мне голаў:
«Божа,
Божа, Айцец наш нябесны, за што?!»

Вось прычакала, дык прычакала!
Кропка пастаўлена тлуста,
і ўсе пры сваім.
Лішніх пытанняў ніколі не задавала,
Вось і выядвае вочы
прыкрасць — не дым.

А прыгажосці ж пабачылі разам!
Воблакі, цені, суквецці,
лісты на вадзе.
Ў лішніх пытанняў
Ёсць лішнія, пэўна, адказы.
Курчацца, бедныя, ў скрусе,
не ведаю — дзе...

**Свет без цябе**

Свет без цябе —
Гэта пустка без гуку і рэха,
Гэта сірочай слязы,
Кулачкам і уцёртае,
след.
Лепшай паловы жыцця
Найсамотная веха —
Вось што такое мой белы
І апусцелы мой свет...

* * *
Ізноў шапацела лісце
У нас пая нагамі,
Пакуль мы шукалі выйсця,
Дзяліліся снамі.

Калі раскрывалі душы,
Дзе роспач стыла,
Дубок, малады і дужы,

Даваў нам сілу.

А як абабеглі стрэлкі
Свой круг кароткі,
То спачувальна елкі
Пасталі збоку.

А потым праспекта хваля
Нас раскідала,
Як трэсачкі —
далей, далей...
І нас не стала.

* * *
За стрэлкамі сачыць, званка чакаць,
Перабіраць магчымыя прычыны...
Мой новы дзень
панылы і нішчымны.
Не заслужыла лепшага, відаць.

Цярплівасці вучуся.
Стрэлак тых
Лянівае пасоўванне прымаю
Як непазбежнасць.
Кара не малая —
Чакаць мо век,
а саграваццa міг.

Цяпельца засланяю ад слаты —
Як быццам бы Выпацку б'ю паклоны,
Які то небяспечны, то шалёны,
То ўслужлівы,
то проста залаты.

* * *
На захад ідзём, на заход.
Закоціцца сонца за гмахі,
Абвострацца гукі і пахі,
Са сховішчаў вылезуць жахі,
Каб сніцца і мірсціцца.
Год
Міргнуць не паспелі — прапаў...
Усё падбіваем рахункі,
Збіраем уяўныя клункі
(Папрокі замест пацалункаў,
Пакуты заместа забаў).
А сонца на пасмы аблок
Паклала апошнія блікі.
Паволі на горад вялікі—
Цікаўны, мільёнаязыкі —
Спускаецца змрок...

**Буду жыць**

Буду спаць,
не думаць ні пра што,
Спачываць.
Заплюшчыла ўжо вочы.
Прашуміць запозненa аўто,

Капне дождж, сабака заякоча...

Хай спачне
і мой наступны дзень,
Яшчэ не сфармаваны канчаткова.
Заўтра новы выблісне прамень,
Ноч змахну
і буду жыць нанова.

* * *

Суладдзе душ — вялікая раскоша.
Хто зведае яго,
ужо не зможа
Здаволіцца падробкай, сурагатам.
Была і я — нядаўна шчэ! — багатай.

А зараз — толькі рэшткі,
толькі крошкі,
Акрыленасці ўчорашняй ні трошкі.
Папрокі, высвятленне драбязы.
Адчужанасці горкія азы.

Усё, як і заведзена спрадвеку.
Няма альтэрнатывы ў чалавека,
Які меў глупства легка прыкіпець
І для каго расстанне —
нібы смерць.

* * *

Згушчаліся цені,
і сонца паказвала край
З-за елак зубчатых
усё яшчэ летняга сквера.
І восень, і вечар
як быццам захоўвалі меру,
Нібы суцяшалі:
не позна яшчэ, не зважай.

Вунь промень вясёлы
і лісцік вясёлы такі...
Так, зыркае промень,
і лісцік трапечацца жвава.
Аднак жа прыкметы другія
і злева, і справа.
Хоць цэлая ваза,
ды скора збіраць чарапкі.

Хоць фарбы гарацць,
ды звужаецца лапік святла
На гладзі рачной,
і душа, як разважыш, не тая...
Качар у качкі
частунак, глядзі, адбірае,
Сцвярджаючы тым
перамогу маленькую зла.

А там, дзе суцэльны,
на ўсіх размяркованы змрок,
Дзе нехта за нас
падаб'е, падсумуе рахункі,

Ніводзін прамень
не абліжа лісліва мне рукі,
І больш не падмане
ніводзін зялёны лісток.

* * *

Зноў я ўнурана і сцята,
Ад здагадкі ў грудзях стыне.
«Аперэтачная здрада»,—
Скажаш ты,
як морак згіне.

На сюрпрызы ты багаты.
Хутка новага чакаю.
Аперэтачныя здрады
Як бяду перажываю.

Бо ад іх на сэрцы меты,
Паглядзі: рубцы і шрамы.
Бо жыццё не аперэта
І любоў не аперэта,
А вышэйшай пробы
драма.

* * *

Зіма вярнулася...
Напэўна,
Яшчэ сваё недабыла.
Адно каўтнулі з лужын пеўні,
Крыху пабольшала святла.

Даймае Балтыка вятрамі,
Скідае снежны пласт вагу...
Развесніцца...
І толькі з намі
Што будзе — ведаць не магу.
Прапалі, выракліся знакі,
Прымоўклі руны і Таро.
І нават словы-небаракі
Ідуць скрозь сілу на пяро.
Усё было, усё зжывалі.
Каторы круг?
Каторы год?
Нас то анёлы цалавалі,
То вёў нячысцік цераз брод.
І вось прадвесне —
без прасвету.
Сцюдзёны пыл. Будзённы вір.
І я падобна на камету,
Што траціць свой арыенцір.

* * *

Падсыпае снегу, падсыпае...
Бель непераможна наступае.
Што ж я мітушуся,
як сляпая?

Будзе так, як будзе. Немінуча.
Толькі ты няпэўнасцю не мучай.
Я была і стану шчэ відушчай.

Мне турботы не дадуць прапасці.
Дзве крывінкі поруч —
Лена з Насцяй.

* * *

Як жорстка лес кіруе мною.
Таму мае лятункі-мроі
Даўно развеяны, як дым.

Ды беспрасветныя настроі
Яшчэ даюць часамі збоі,—
Дык дзякуй Богу і на тым.

* * *

Калі адчай
хапае мёртвай хваткай
За горла,
бо разлучана з табой,
Дапытваюся ў Бога, як фанатка:
«Дык што далей?
У чым ратунак мой?»
І ты ж таксама
з тварам памярцвелым
Блукаеш пры аказіі такой,
І робіцца з капейку
свеце белы,
І невядома, ў чым ратунак твой.
Ды неяк выдзіраемся з балота
(Яшчэ шкадуе доля нас, дурных),
І кожны ціха радуецца ўпотай.
У чым ратунак?
Ды у нас саміх!

**Дзея III**

**РАЎНАВАГА**

* * *

Жыццё сканцэнтравана на адным —
Адным табе.
А ўсё, што побач, вокал,
Становіцца няісным і чужым,
Становіцца нявартым і далёкім.

Часова. Разумею. Гэты свет
Часовы ўвесь —
да болю, да абразы.
На нейкай невядомейшай з планет
Твая душа з маёю будуць разам.

Ужо ж і нагаворацца! Бо там
Ніхто не перашкодзіць, спадзяюся.
А тут я нат зычліўцам і сябрам
Даверыць нашы парасткі баюся.

У кволага жывучасці запас
Неверагодны,
ды каб не сурочыць...
Усе мне даравалі —
толькі час
Чамусь з дакорам пазірае ў вочы.

**Даруй**

Даруй мне!
Дарую і я.
Абмяняемся дараваннямі.
Сыдуць крыўды кудысьці зданямі
(А іх немалая сям'я).

Навучымся шкадаваць.
Шкадаванне любові вышай,
А не — дык святлей і цішай.
Мы прысталі агнём палаць.

Агонь не дарадца нам,
Ён спапяляе і мучыць.
Не прага зусім нас лучыць —
Ты ведаеш гэта сам.

Даруй жа. Вазьмі руку.
Пройдзем па даўніх сцежках,
Згадаем цану усмешкі,
Змалоўшы з мукі — муку.

**Каляднае**

Такою пустою
планета яшчэ не была.
Такою бязлюднай,
пазбаўленай сэнсу і зместу.
Ўзышло і набракла
самоты ліпучае цеста,
І дні выгараюць дарэшты,
да самага тла.
То свята прыждалі. Каляды.
Стары сімбіёз
Паганства з царкоўным канонам.
Усё як належыць:
Аўсяны кісель згатаваны
і рыбіна свежая,
Зварыла куццю
(толькі сена мужык не прынёс).
І ты за сталом,
там паселі бацькі і браты.
Там з сенам ніякіх праблем,
дый гаворка другая.
Там родзіч, узяўшы ў губу,
падпяяць запрашае,
І ты падпяеш.
Галасочкам адораны ты.
У твары анёльскае штосьці,
калі не злуеш,
Калі улагоджаны дух
праз цябе азавецца.
Далёка — як быццам няма,
ды з табой маё сэрца.
Банальна, што зробіш...
Спявай жа, мой голуб, і еш.

* * *

На адлегласці нельга кахаць.
Можна пісьмы
зрэдзь часу пісаць,
Можна ціха ўздыхаць, сумаваць,
Невядома каго дакараць,
Дні лічыць ды сустрэчы чакаць.
На адлегласці, дружа, кахаць —
Гэта значыць паволі канаць.
Не знаходзячы дома прытулку,
Гэта цень мой блукае па вулках.
Толькі цень,
толькі зморана цень
Пра цябе ўспамінае штодзень.
І каб знаў,
што і ты дзесь такі,—
Да цябе б ён пайшоў напрасткі.

* * *

Сінечы прыбыло,
і снег сышоў нарэшце.
Аголенасць галін,
халаднаваты вецер.
Яшчэ адзін раздзел
у кнізе года
Перагарнулі,
прычакаўшы згоды.
Яшчэ адна вясна
сіло звівае,
Уборы надзяе,
а я — не маладая.
Хоць не адразу, усё ж
выходжу на дарогу,
За паўнату быцця
удзячна Пану Богу.
А хто мяне на смех
падніме — вось такую
Таго не асуджу,
а толькі пашкадую.

**Туман**

Адвячоркам па вулках блукалі,
І туман быў эфектны такі,
Быццам нехта здымаў меладраму,
А пад камеру трапілі мы.

Гэта фільм пра вялікія страсці,
Пра сляпую бядачку-любоў,
Што паволі расплюшчвала вочы,
Набывала і годнасць, і зрок.

Заблудзіліся.
Спежка кружляе…
На ўскраіне гарадской
Раскашуюць быльнёг і кустоўе,
Як у сэрцах — туга і разлад.

І калі мы нарэшце з туману

Неяк выбрацца здолелі, то
Перад намі знаёмая вулка
Праявілася, як негатыў.

Мы прыйшлі на ранейшае месца!
Нас туман павадзіў і пусціў.
Ўсе пачвары у ім засталіся
І расталі з ім разам навек...

* * *
Нараджаюцца светлыя думкі,
Калі трошкі глынеш цішыні.
Першы чмель
                    каля дзічкі зазумкаў,
Пачаліся гарачыя дні.

Заклапочана птаства лятае,
Адкрываецца дачны сезон.
І пакута мая ўся былая —
Толькі сон,
                    толькі блытаны сон.

Тчэцца роднасць
                    з малых валаконцаў.
Мы яе разрывалі хіба?
І як росы знікаюць пад сонцам,
Так прапала журба.

* * *
Калі паспелі ягады паспець?
Пагрэцца не было яшчэ нагоды,
Не мелі ні настрою, ні пагоды.
Калі паспелі ягады паспець?

Спакой нам толькі сніцца, далібог.
Стасункі высвятляем апантана.
Так цяжка мы звязалі, што парвана,
І што нам дзень наступны прыбярог?

Дык хопіць азірацца, ўспамінаць...
Сярэдзіна, вышэйшы момант лета.
Саспела і душа, хоць не сагрэта,
Навучана трываць і дараваць.

**Світальнае**

Прачнуцца да аўтобуса. Ляжаць
З паўнюткай галавой, а семкі-думкі
Ну аніяк не хочуць прарастаць,—
Павольныя, цягучыя, як гумкі.

Усё я перадумала даўно.
Каторы круг? Не маю уяўлення.
Лепш сніла б каляровае кіно,
Сумбурнае і поўнае значэння.

Напэўна, дзень мой выдасца цяжкім
Гнятлівым,
                    бесталковым, неласкавым.

Калі мы без прычыны дай не спім —
Чакай, што апануюць заўтра справы.

Што набяжыць, усё перараблю
І вытрываю.
Так пастанавіла.
Цяпер я на уздыме, бо люблю.
Адкуль адно бярэцца тая сіла?!

Аўтобус за сцяной бярэ разгон,
Прывычна разбудзіўшы паўквартала.
Пужлівы мой, непаслухмяны сон
Не раз яго гудзенне абрывала.

Патрошку ажывае сонны двор,
Ды я ўжо сну магчымаму не рада.
І што задоўгім аказаўся твор,
Дык то не я,
а ночка вінавата.

**Разам**

Нас у траве
толькі птушкі пабачаць і сонца,
Яшчэ НЛА, можа быць,
ды выпадковы анёл,
Што прыляцеў не ў пару
пры сур'ёзнай гамонцы
І далікатненька знік —
гэткі імклівы Эол.

Марым пра лёгкасць,
а любім так цяжка і трудна,
Так непапраўна —
ад роспачы сэрца смыліць.
З жару — ў купель ледзяную,
са святаў — у будні,
З кручы — у апраметную,
і трэба усё пераяжыць.

Сонца нас слепіць,
анёлы заломваюць рукі,
Птушкі зусім не зважаюць —
заняты сваім.
Мусім трываць,
колькі ні суджана мукі,
Вынесці мусім усё,
што па сіле двам.

* * *

Ты памаўчы, не гавары
Аб звыклым верадзе.
Твае запруды і віры
Яшчэ наперадзе.
Яшчэ пакідае цябе
І паматляе,
Маршчынкі высеча на лбе —
Я добра знаю.
Ты толькі чыстую душу

Не дай зьначыць,
Што ўжо сягнула за мяжу,
Дзе многа бачаць.
Ты толькі веру захавай
На самым старце
У будучынь сваю
і край,
Што веру страціў...

* * *

*Мінулае — мінулася.*
*(З гаворкі)*

Мінулае мінецца — і тады
Інакшай стану я,
зьначышся і ты.
Абступяць людзі іншыя і рэчы,
І паглыне нас
космас чалавечы.
Пакуль жа мы —
нібы двайныя зоркі,
Чый лес і захапляючы, і горкі.
Відны усім цікаўным на зямлі.
Такі наш кон...
Такое «сэ ля ві»...

* * *

Прайсціся скверам...
Распужаць лісты,
Што ўслалі сцежку...
Водар лістапада
Ўдыхнуць,
а ён настоены, густы
І для душы — вялікая прынада.

Павее вечаровы халадок
Пранізліва і трошкі безнадзейна.
І позняя мілосць,
і гэты ранні змрок
З'яднаюцца, зліюцца непадзельна.

* * *

Мы беспрытульныя істоты,
Мы два вандроўнікі-бадзяжкі
І так залежым ад надвор'я,
Як мурашы ці матылі.
Усе зялёныя куточкі,
Усе пратоптаныя сцежкі,
Усе заценены вулкі

Мы неўпрыкметку абышлі.
Зіма нам ворагам. Дадому,
Як пугай, сцюжай паганяе.
Калі ты сіні і няшчасны,
Якая, ўрэшце, тут любоў?
І толькі сцятыя пупышкі
Цяплу паверылі, размяклі,
Прадрала пчолка вачаняты —
Мы ажылі і рады зноў.

Адсюль і боязь памяшканняў,
Дзе мы, што ў клетцы, і напруга

У сценах звыклых і нямілых —
Няволя горай, чым зіма.
І што нас гэтак паяднала,
І хто сасватаў нашы сэрцы,
Не папытаўшыся дазволу,—
Не разумею я сама...

**Навагодняе**

Усё было.
Мы блукалі ў тумане
І не ведалі, лепей ці стане.

Адхіленні былі і спакусы
І змяіныя нават укусы.

Нас далека разводзілі сцежкі,
Мы ж насустрач
спяшаліся бежкі.

Новы год як сустрэнем чарговы,
Дык гадаем:
апошні мо — новы?

Ужо ж як будзе...
Даруйце мне, людзі:
Ў вас такога дарунку
не будзе.

**Удзячна дню**

Удзячна дню,
пражытаму не марна.
Я ветла азірнуся ўслед яму.
І хоць вакол то сонечна,
то хмарна —
Усё прыму,
усё як ёсць прыму.
Неспадзяваны дар і пакаранне,
Навуку,
што падчас здаецца злой.
Само сабой
складаецца літанне —
Як гэты вершык праставаты мой.
Куды адно дзяецца тая стома!
Я новая
прад явою вясны.
І што такое вернасць —
мне вядома.
А здрада?
Гэта дзеці даўніны.

* * *

Вы мне пра каханне,
а я пра Любоў.
Дазвольце мець думку уласную.
Зачаста пілі мне
зламысснікі кроў,
Слабою была і няшчаснаю.

Мне вера не проста далася, але.
Кал і ж насланнё я адолела —
Мне зорка Любові
заззяла ў імгле,
І сілы, і гарту паболела.

Што мной кіравала,
даўно адышло.
Чым я уладала,
та го ўжо не шкода мне.
За новае, яснае ў сэрцы святло
Аддам і гардыню,
і страсць,
і свабоду я.

**Асенні мёд**

Асенні мёд...
Няйначай — верасовы.
Пазалацелі
і загуслі словы.
Я нават разабрацца
не змагла,
ЦІ кветка я,
ці зумкая пчала.

Галоўнае —
ў сугучнасці са светам,
З самой сабою
і парою гэтай,
З імжою
і празрыстасцю нябёс,
З усім, што нёс
і што ўручыў мне лес.

***Эпілог***

* * *

Гаючы мой!
Так доўга не было
цябе паблізу.
Цемра засмактала.
Душу хацела выпіць,
атруціць,
зрабіць мяне нічым —
і пасмяяцца.
Цябе ж яна баіцца,
й нездарма.
Твая прысутнасць для яе —
пагроза
і нават болей — скон.
Вось і сышла,
гатовая праціснуцца
скрозь сцены.
Ўдагонку
стрэлы промняў паляцелі,
перамагло супольнае святло.
Развеяна
усіх напасцей тло.

## ЗМЕСТ


**Паміж явай і сном**

*** Што трэба траве…
*** Груша нас асыпала пладамі…
*** Бурылі цэрквы…
*** Штосьці пуста ў маіх засеках…
Дзірван
*** Тады лунаюць згадкі-мроі…
*** Я слухала, як дождж ішоў…
*** Дзе вы, гады мае, блукаеце…
*** Прачынаецца дзень…
Натоўп
З гарадскога фальклору
У чарзе
Перасяленка
Горад
*** Шчэ спалі птушкі…
*** Калі народ ідзе на звод…
*** Гісторыя — не могільнік глухі…
*** Як б'ецца муха ў павуціне…
Іранічнае
*** Мышыным піскам у ката ў зубах…
*** Хто звёў на дарожцы
Трыпціх памяці
*** Нас падхапіла існая плынь…
*** Я гэтак гляджу…
Вечаровае
Крылы
*** Сон быў крамяным…
*** Чым я свабоду заслужыла…
Начныя матылі
*** Ты зноў запытальна глядзіш…
Аналогіі
*** Сцэнарыі выдатна піша Бог…
Амаль жарт
*** Прысніўся мне сад…
*** Мы — паралельныя, горнія светы…
Сузіраючы ружы
Хто наступны?
Спяшаўся ты…
Лясы
Міцкевічаў дуб
Ля Іслачы
Зацьменне месяца
Паміж явай і сном
Я там была?
*** Як бляшанае, лісце грыміць…
*** Ля піўзавода пахне соладам…
*** Дзе лета залатыя міражы?..
*** Пачуцці — хісткая апора…
*** Спярэшчаны палі…
*** Вясна. Ды холадна цюльпанам…
*** Не стала глебы пад нагамі…
Цвыркун
Жалобнае
Калі мы адыдзем…
Саламяны «павук»
Званок
*** Дзвюх удачаў запар не бывае…
*** Каштана сяміпалая далонь…
*** Птушкі нябесныя…
На сцэне дня

**Я шукаю на тварах святла**

*** Мне праніклівасць доля дала…
Іголкай промня
*** Прадажнасць, як іржа…

*** Ў чалавеку людскае мне дарага…
*** Што рабіць мне…
*** Дошкі гонару апусцелі…
Пакаранне
Набываю ці трачу?
*** Душа павінна вызваляцца…
Ранішні верш
*** Дзіця пераступае ганак…
Памяці дзядулі
*** Сустрэла суседку…
*** Па моцнаму марозу…
Мастачкаю была б…
Эцюд
Яна купляла гладышок
*** Ішла і плакала жанчына…
*** У магазіне, дзе таўпяцца…
Арэх
*** Душу паволі вытанчаць пакуты…
Сапсаваны гадзіннік
*** Як вогнішча прыцягвае пагляд…
*** Пакуль грахі не выгараць датла…
*** Мы ўсё зразумеем…
*** Не можам ведаць…
*** Паспела герань расцвісці…
*** Пастукаю ў суседнюю душу…
*** Сышоў вячэрні морак з вышыні…
Быль пра бабку Паўліну
Быль пра голага
Маналог кактуса на падваконні
Маналог паўднёвага дрэва
Жаўна
Дзічка
Грыбніца
Лялька
*** Пад нагамі галінка мімозы…
*** Як цяжка ўсходзіш ты, насенне…
Я гляджу на сябе
Старыя здымкі
Равесніца
Быў сон…
*** Узрост выцясняецца ўзростам...
*** У зялёным небе жніўня…
*** Людзі, адграбайцеся ад зла…
Малітва

**Асенні мёд**
(Лірычная драма ў 3-х дзеях)
*Пралог*
*** Давай адгародзім кавалачак раю…
**Дзея 1. РАЙ**
*** Прытушы пагляд свой, любы…
Брама
*** Аслепнуць на момант…
*** Дзе навальніца — там і пажар…
*** Пячаткай зямною…
*** Ісці ды усміхацца…
*** Як людзі ў свеце…
Юр'я
*** Я слухаю цябе, як жаўрука…
*** Снег усё падае і растае…
*** Калодзеж зусім не бяздонны…
*** Як выглядвае сонца — для нас…
*** Напэўна, гэта атавізм…
*** Як рака на лузе завіваецца…
*** Мне кожны дзень — як падарунак…
*** Дзе любові мяжа…
*** Ты сярдзіты быў, каханы…
Згадка

*** Як чаранок да галіны ўвесну…

**Дзея ІІ. АПРАМЕТНАЯ**

*** «Нашто ты мяне палюбіла?..»
*** Сонца вісела між двух дамоў…
*** Ад заляцанняў да спазнання…
*** Бінты ад раны адрываць…
*** Атуленай была і захінутай…
*** Ў горадзе вецер…
*** Прасіла горкай праўды…
*** Прадаў каханне…
Дакор
*** Я аддаляюся, адыходжу…
Свет без цябе
*** Ізноў шапацела лісце…
*** За стрэлкамі сачыць…
*** На захад ідзём, на заход…
Буду жыць
*** Суладдзе душ…
*** Згушчался цені…
*** Зноў я ўнурана і сцта…
*** Зіма вярнулася…
*** Падсыпае снегу, падсыпае…
*** Як жорстка лес кіруе мною...
*** Калі адчай хапае мёртвай хваткай…

**Д з е я ІІІ. РАЎНАВАГА**

*** Жыццё сканцэнтравана на адным…
Даруй
Каляднае
*** На адлегласці нельга кахаць…
*** Сінечы прыбыло…
Туман
*** Нараджаюцца светлыя думкі…
*** Калі паспелі ягадыпаспець?..
Світальнае
Разам
*** Ты памаўчы, не гавары…
*** Мінулае мінецца…
*** Прайсціся скверам…
*** Мы беспрытульныя істоты…
Наваго дняе
Удзячн а дню
*** Вы мне пра каханне...
Асенні мёд
*Эпілог*
*** Гаючы мой!..

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

**Каржанеўская Г.**

Асенні мёд: Вершы розных гадоЎ,— Мн.: Маст. літ., 1999 - 159 с.

ISBN 985-02-0120-7.

«Асенні мёд» — гэта своеасаблівы дзённік вялікага, неспадзяванага пачуцця. Гэта споведзь даверлівай жаночай душы, якая шмат перажыла і адпакутавала. якая ўмее цаніць імгненні шчасця і навучылася даравацъ. Акрамя аднайменнага цыкла кніга Галіны Каржанеўскай змяшчае раздзелы, склалзеныя з ужо друкаваных раней і новых вершаў, якія дапаўняюць яе па змесце і па настроі.

**УДК 882.6-1**
**ББК 84(4Беи)6**

Літратурна-мастацкае выданне

Каржанеўская Галіна Анатольеўна
**Асенні мёд**
Вершы розных гадоў

РэдактарЛ. В. Дранько-Майсюк.
Мастакі М. С. Будавей. Л. С. Шчасная.
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава.
Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова.
Карэктар Я. А. Бебель.
Здадзена ў набор 23.06.99. Палп. да друку 08.09.99. Фармат 70х90 1/32. Папера афс. 1. Гарніт>ра Тып Тайме. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 5,85. Ум. фарб.-адб. 6,14. Ул.-выд. арк. 4.83. Тыраж 1200 экз. Зак. 1849.
Выдавецкае дзяржаўнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія Л В .N4 3 ад 19.11.97.
220600. Мінск, праспект Машэрава, 11. Друкарня «Перамога». 222310, Маладзечна, вул. Таўлая. 11.